НОВЫЯ ГЕРОІ НА АЛІМПІЙСКІМ ГАРЫЗОНЦЕ 8

КАЛІ ЖЫЦЦЁ НАВУЧЫЛА БЫЦЬ МАЙСТРАМ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 ВЕРАСНЯ 2020 г. СЕРАДА № 185 (29299)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ТУРЧЫН, старшыня Мінскага аблвыканкама:

«Арэнднае жыллё іграе важную ролю для прыцягнення спецыялістаў у рэгіёны, у тую ці іншую сферу эканомікі. Улічваючы мабільнасць працоўных рэсурсаў, моладзь сёння не спяшаецца набываць жыллё ва ўласнасць. І тэма арэнднага жылля становіцца ўсё больш актуальнай».

КАРОТКА

• Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі Цуй Цымін узнагароджаны Ордэнам Пашаны за значны асабісты ўклад у развіццё і ўмацаванне палітычных, гандлёва-эканамічных, крэдытна-інвестыцыйных, навукова-тэхнічных і гуманітарных сувязяў паміж Беларуссю і КНР.

• Уведзены абмежаванні на наведванне лясоў у Каст-рычніцкім раёне Гомельскай вобласці, а таксама ў Стаўбцоўскім і Салігорскім раёнах Мінскай вобласці.

• Вядомы расійскі навуковец, фізік-тэарэтык, матэматык, філосаф, багаслоў і перакладчык Сяргей Харужы памёр 22 верасня ва ўзросце 78 гадоў.

• Авіякампанія «Белавія» аднаўляе рэйсы ў Маскву з 30 верасня. Яны будуць выконвацца па серадах у аэрапорт Дамадзедава.

• У пункце пропуску «Урбаны» («Сілене») 25 верасня магчыма запаволенне пагранічнага кантролю з-за правядзення работ у рамках рэканструкцыі гэтага пагранперахода.

Ласка і клопат

Жыхар пасёлка Баравуха-1 Полацкага раёна ўзяў з прытулку для хатніх жывёл сабачку з хворымі лапамі, зрабіў для яго адмысловае крэселка на веласіпедзе. Кожны дзень ён адпраўляецца са сваёй Ласкай — так наш сціплы герой называе сваю гадаванку — на недалёкі шпацыр. **Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Сваё жыллё

ДОМ «ПАД КЛЮЧ», або Зборны канструктар

Індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва ў Беларусі ў апошнія гады набірае папулярнасць. Не сакрэт, што ў агульнай структуры ўведзенага ў эксплуатацыю новага жылля індывідуальныя дамы займаюць каля 40 %

А сёлета буйным будаўнічым прадпрыемствам сталі прапаноўваць больш актыўна развіваць комплексную індывідуальную жылую забудову. У Мінбудархітэктуры спадзяюцца, што гэты кірунак будзе развівацца і далей, заявіла на прэс-канферэнцыі начальнік аддзела жыллёвага будаўніцтва ўпраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Кацярына УСЯНКОВА.

Больш за ўсё асобнага жылля пабудуюць у Мінскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцях

Нягледзячы ні на якія эканамічныя цяжкасці ў краіне, з году ў год захоўваецца павышаны попыт на індывідуальныя дамы. Многія людзі звяртаюцца па крэдыты, у іх ёсць жаданне будаваць або купляць такое жыллё. СТАР. 4

Беларусь памятае

Сямнаццаць вярнуліся з небыцця...

Магілёўскія пошукавікі нарэшце знайшлі пад Слаўгарадам тое поле бою, пра якое прачыталі ў архіўных дакументах чвэрць стагоддзя таму

СТАР. 5

Да пошукаў гатовы.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Галоўнае, каб мы дамовіліся пра супрацоўніцтва, і многае можам зрабіць»

Прэзідэнт Беларусі правёў перагаворы з губернатарам Прыморскага краю

Сустрэча губернатара Прыморскага краю Алега Кажамякі з Аляксандрам Лукашэнкам — своеасаблівы развітальны акорд беларускай камандзіроўкі, якая пачалася 19 верасня. За некалькі дзён далёкаўсходнія госці наведалі машынабудаўнічыя і харчовыя прадпрыемствы Магілёўшчыны, правялі перагаворы з кіраўніцтвам Саўміна, Міністэрствам сельскай гаспадаркі Беларусі і завіталі на флагманы сталічнай цяжкай прамысловасці — МТЗ, «Амкадор», «Белкамунмаш».

Гэта першы візіт у нашу краіну кіраўніка Прымор'я за некалькі гадоў, але далёка не першы для Алега Кажамякі. Нашчадак беларускіх перасяленцаў развіваў рэгіянальныя сувязі Беларусі і Расіі на пасадзе губернатара Амурскай, Сахалінскай абласцей, за што летась атрымаў з рук Аляксандра Лукашэнкі ордэн Пашаны.

Прэзідэнт назваў кіраўніка Прымор'я «заўсёды жаданым госцем у Беларусі», дадаўшы, што дзе б Алег Кажамяка ні працаваў, Беларусь будзе рабіць усё, што неабходна для супрацоўніцтва.

Па словах Прэзідэнта, «Магілёўшчына супрацоўнічае напрамую з далёкаўсходнім краем. Нічога, калі Магілёўшчына ад гэтага атрымае нейкі прырост — гэта будзе на карысць усёй дзяржаве», — дадаў кіраўнік краіны.

Ён падкрэсліў, што, незалежна ад геаграфіі, беларусы не разглядаюць Уладзівасток як чужы горад: «Мы часта ўспамінаем пра сваю Айчыну ад Брэста да Уладзівастока. Так што вы жывяце ў нашай Айчыне, і мы заўсёды будзем развіваць супрацоўніцтва ў гэтым плане».

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў дапамогу ў будаўніцтве касмадрома «Усходні». «Мы вельмі ўважліва зараз падыдзем яшчэ раз да гэтага аб'екта. І прэзідэнт Расіі мяне прасіў паглядзець. Мне хацелася б паўдзельнічаць у будаўніцтве гэтага касмадрома, паказаць нашы магчымасці і на што здольныя беларускія будаўнікі. Я гатовы перакінуць туды трэст ці два. ***Галоўнае, каб мы дамовіліся пра супрацоўніцтва, і многае мы можам зрабіць на гэтым касмадроме.*** Пры тым, па цэнах і якасці нас там наўрад ці нават японцы або карэйцы перасягнуць», — сказаў Прэзідэнт.

Тавараабарот Беларусі і Прыморскага краю са студзеня па ліпень склаў сёлета 9,1 мільёна доларaў. Ён павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам 2019 года амаль на 18 працэнтаў. Сальда станоўчае ў 7,5 мільёна. Аснова экспарту — грузавыя аўто, «малочка». У рэгіёне адсутнічаюць прамыя тавараправодныя сеткі беларускіх прадпрыемстваў. Пастаўкі тавараў народнага спажывання рэалізуюцца прамымі дагаворамі куплі-продажу, праз аптовыя структуры-пасрэднікі, дзейнічае дылерская сетка па рэалізацыі прадукцыі машынабудавання.

Па словах кіраўніка Беларусі, прэзідэнт Расіі на сустрэчах вельмі шмат увагі надае Прыморскаму краю і настойвае, каб Аляксандр Лукашэнка пабываў у тых мясцінах. Сваё падарожжа па Далёкім Усходзе Прэзідэнт нашай краіны мяркуе пачаць з касмадрома, калі там будуць працаваць беларускія рабочыя.

Беларусы гатовы ўдзельнічаць не толькі ў пастаўках тэхнікі, але і ў яе гарантыйным і сэрвісным абслугоўванні. ***«Мы гатовыя тут і па фінансаванні выгадныя ўмовы прапанаваць, як мы гэта звычайна робім.*** Электрычныя аўтобусы, МАЗы, трамваі, тралейбусы — вельмі вялікі ў нас у гэтым вопыт. І на газаматорным паліве мы можам прапанаваць аўтобусы», — запэўніў кіраўнік краіны.

Далёкаму Усходу вядомыя магчымасці Беларусі ў сельскай гаспадарцы, бо з гэтага некалі і пачалося супрацоўніцтва. Выказваў інтарэс да гэтага і прэзідэнт Расіі Пуцін.

«Я яму кажу: вы ў Кітаі купляеце прадукты харчавання. Неабходна свае стварацца, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.— Мы гатовыя ў гэтым кірунку працаваць і ў сельскай гаспадарцы, і па насенні, і аграрадніцтве, і пладаводстве».

Прапанаваў Прэзідэнт і айчынны пасадачны матэрыял для садоў, каб пакаваць іншым краінам, «што самі ўсё можам». Гатовы беларусы пастаўляць у Прымор'е і сваю мяса-малочную прадукцыю, дзіцячае харчаванне, як гэта робіць Кітай.

«У мяне няма неабходнасці вас у нечым запэўніваць. Мы з вамі даўнія сябры. Лічыце, што мы сябры назаўсёды і гэта справа гонару, што мы будзем працаваць у Прымор'і і супрацоўнічаць з вамі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да губернатара Прымор'я.

Марыя ДАДАЛКА.

• Каментарый у тэму

Алег Кажамяка паведаміў, што дэлегацыя з Далёкага Усходу прыбудзе на выстаўку «Белагра» (пройдзе з 29 верасня да 4 кастрычніка).

У размове з журналістамі губернатар заявіў, што неабходна пашыраць знаёмства на ўзроўні кіраўнікоў прадпрыемстваў, развіваць прадстаўніцтва Беларусі ў краі. «Мы абазначылі канкрэтныя праграмы, звязаныя з пастаўкай беларускіх сельгаставараў для жыхароў Прымор'я, таго, што мы не выпускаем, — сыры, масла, мяса. Гэта важна для школьнага харчавання, каб дзеці елі якасныя прадукты. Таму ў «Белагра» будуць прымаць удзел нашы гандлёвыя сеткі, тыя, хто забяспечвае дзіцячым харчаваннем нашы школы, дзіцячыя сады», — дадаў Алег Кажамяка.

Закупяць для Прымор'я і нашы электробусы, а беларускія будаўнікі, магчыма, будуць працаваць у гэтым расійскім рэгіёне над сацыяльнымі аб'ектамі.

«Мы дамовіліся, што ў лістападзе прадстаўнікі вытворцаў з Беларусі на чале з Леанідам Зайцам, губернатарам Магілёўскай вобласці (вызначаны кіраўніком групы па рабоце з Прымор'ем) выедуць, каб на месцы распрацаваць дарожную карту і далей рабіць крокі па павелічэнні гандлёва-эканамічных сувязяў», — паведаміў Алег Кажамяка.

Меркаванне

«Трэба берагчы самае дарагое, што мы маем»

Клапаціцца пра дзяцей і абараняць іх ад усякага роду пагроз, здавалася б, натуральны закон прыроды, важнасць якога нікому не трэба тлумачыць. Але, як паказвае практыка, часам жыццё ўносіць свае карэктывы і сістэма дае збой... І тады ўжо спрабуеш зразумець, хто можа абараніць правы дзіцяці, і адказнасць бацькоў ці дзяржавы тут большая. Па адказы на некаторыя пытанні, што непакояць сёння грамадскасць, «Звязда» звярнулася да члена Нацыянальнай камісіі па павах дзяцей Ігара Бузоўскага.

— Ігар Іванавіч, акрэсліце, якія зараз найбольш вострыя праблемы ёсць у нашай краіне, што датычацца тэмы парушэння правоў дзяцей?

— У цэнтры ўвагі тых, хто на ўзроўні дзяржавы і ў колах неабыякавых грамадзян непакоіцца і займаецца праблемамі дзяцінства, падтрымкі і выхавання дзяцей, сёння паранейшаму востра гучаць шматлікія тэмы, актуальныя не толькі для большасці краін свету. Мы жывём у глабальным свеце і знаходзімся ў вялікай геапалітычнай прасторы, якая наўпрост ці ўскосна закранае такога роду праблемамі і наша грамадства. Таму тэмы гвалту ў сям'і, распаўсюджванне наркотыкаў, сацыяльна небяспечныя ўмовы — з'яўляюцца актуальнымі і для нас. Наша Нацыянальная камісія па правах дзяцей працуе над тым, каб абараніць дзяцей ад усіх згубных рэчаў такога характару.

— Скажыце, у святле абвостранага палітычнага супрацьстаяння, якое мы назіраем апошнія месяцы ў Беларусі, як абараніць дзяцей ад уцягвання ў гэтыя падзеі?

— Калі канкрэтна па згаданай сітуацыі, то так, у нас зараз актыўна праходзяць працэсы грамадска-палітычныя, звязаныя з выбарчай кампаніяй кіраўніка дзяржавы. І адбітак яны знаходзяць у розных плоскасцях з закрананем эканамічных, сацыяльных, міжнародных пытанняў. Апошнім часам да нас звяртаюцца прадстаўнікі грамадскіх колаў, бацькі з абурэннямі, што бачаць па СМІ, у інтэрнэце і на вуліцы, як удзельнікі несанкцыянаваных акцый уцягваюць дзяцей, падлеткаў у сваю дзейнасць, альбо дзеці туды трапляюць з-за адсутнасці належнага кантролю з боку дарослых. І ў гэтай сітуацыі паняцце адказнасці ўжо распаўсюджваецца не толькі за сваіх дзяцей, але і за дзяцей у грамадстве ў цэлым. Бо іх інтарэсы і правы ў нашай краіне абараняюцца законам.

На жаль, мы ўжо ў сваёй краіне бачылі, якія наступствы могуць мець масавыя несанкцыянаваныя мерапрыемствы, якія потым ператвараюцца ў натоўп. І якімі наступствамі яны адгукнуліся для асобных сем'яў. То-бок, у такіх сітуацыях пытанне забеспячэння фізічнай бяспекі — першачарговае. І тут яшчэ важна памятаць пра тое, што ёсць маральная, псіхалагічная небяспека, якая ўзнікае ў атмасферы натоўпу. Дзіцячая псіхіка яшчэ нясталая для ўспрымання інфармацыі, тым больш той, дзе прысутнічаюць псіхоз і агрэсія, магчыма, некантралюемыя паводзіны людзей. Асабліва, калі яны знаходзяцца на мяжы з законам і тым больш, калі яго парушаюць.

Таму мы пры неабходнасці будзем ініцыіраваць разгляд такіх выпадкаў і прымаць неабходныя меры. Каб, як мінімум, на прававым узроўні ў тых, хто нясе адказнасць за дзіця, было ўсведамленне ўсіх рызык і наступстваў. Хочацца, каб людзі разумелі, што такія паводзіны і неабдуманыя дзеянні нельга дапускаць. Гэта забараняецца законам і тымі нарматывамі, якія абараняюць сёння нашых дзяцей.

— У прэсе гучала інфармацыя, што такія паводзіны бацькоў будуць атрымліваць прававую ацэнку. Якія могуць быць наступствы?

— Думаю, рашэнні будуць прымацца, зыходзячы з таго, як працягнуць складвацца абставіны. Пакуль што мы фіксуем гэтыя выпадкі, назіраючы за падзеямі, і разумеем, што тут нельга сядзець склаўшы рукі. Пэўныя рашэнні ўжо прымаюцца і работа выконваецца камісіяй. Цяпер праводзіцца шырокае інфармаванне бацькоў і грамадскасці наконт гэтых абставін. Калі спатрэбіцца, то, мабыць, трэба будзе грамадскасці (якая абараняе правы і інтарэсы дзяцей і падлеткаў на ўсіх узроўнях) і непасрэдна камісіі прымаць больш радыкальныя меры па прыцягненні да адказнасці. Бо, нават улічваючы пазіцыю некаторых «гэта маё дзіця, таму што хачу, тое і раблю», ёсць паняцце грамадства, якое сёння павінна бараніць дзяцей і іх правы. І гэта датычыцца не толькі нейкіх рэчаў, якія звязаны з выхаваннем, адукацыяй, але і са здароўем фізічным і псіхалагічным. Клапаціцца пра гэта — прамы абавязак дзяржавы. Бо тое, што адбываецца сёння, проста па-за межамі разумення бацькоў, якія занепакоены спакойным і нармальным фарміраваннем сваіх дзяцей, іх выхаваннем як асоб. Перад вачыма стаяць эпізоды, якія павінны былі б хайпануць на эмоцыях, і яны дасягнулі сваёй мэты, дзе маці трымае дзіця за руку, і тое плача, а яна перад праваахоўнікамі эмацыянальна адстойвае нейкую сваю грамадскую пазіцыю. Калі ўзнікла ў гэтым рэчышчы непаразуменне такога роду, дзе ёсць пагроза бяспекі і здароўю дзяцей, значыцца будзем звяртацца да заканадаўчай базы, каб адстойваць іх інтарэсы.

Я сам бацька і добра разумею, што нідзе акрамя сям'і дзіця не атрымае лепшага выхавання і больш увагі і цяпла, але ёсць межы, якія нельга пераходзіць. І варта перш за ўсё думаць пра сваіх дзяцей. Трэба берагчы самае дарагое, што мы маем.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Бамбардзіроўшчыкі ЗША правялі шырокамаштабную глабальную аперацыю

Амерыканскія стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі, якія вылецелі з авіябаз у Еўропе і ЗША ва ўзаемадзеянні са знішчальнікамі краін — членаў НАТА, здзейснілі масавыя палёты ва Усходняй Еўропе і ў заходняй частцы Ціхага акіяна. Аб гэтым паведаміла Еўрапейскае камандаванне Узброеных сіл ЗША. Паводле дадзеных заходніх маніторынгавых сайтаў, у прыватнасці, быў зафіксаваны палёт стратэгічнага бамбардзіроўшчыка B-52H, здольнага несці ядзерную зброю, паблізу Ленінградскай вобласці ў раёне Фінскага заліва і Эстоніі. У аперацыях прынялі ўдзел ВПС Канады, Нарвегіі і Вялікабрытаніі.

Італьянцы на рэферэндуме выказаліся за скарачэнне месцаў у парламенце



Аб гэтым паведаміла выданне il Fatto Quotidiano. За такую рэформу выказалася каля 70 працэнтаў тых, хто прагаласаваў. Такім чынам, з наступных выбараў у палаце дэпутатаў будзе 400 чалавек замест цяперашніх 630. У сенаце застанецца 200 месцаў у парламенце даволі даўно абмяркоўваецца ў Італіі. Мяркуецца, што такія меры дазволяць дзяржаве сэканоміць грошы і забяспечыць больш эфектыўнае кіраванне краінай.

Deutsche Bank паведаміў аб падазроных здзелках на трыльён еўра

Рэзанансная публікацыя Міжнародным кансорцыумам журналістаў (ICIJ) дадзеных аб падазроных банкаўскіх аперацыях з сакрэтнага дасье Упраўлення ЗША па супрацьдзеянні фінансавым злачынствам (FinCEN) не абышла бокам Deutsche Bank, паведамілі нямецкія СМІ. Банкі, якія вялі бізнес у ЗША з 2000-га па 2017-ты, паведамілі FinCEN аб падазроных здзелках на агульную суму ў $2 трлн (1,68 трлн еўра). Амаль дзве траціны гэтай сумы (1,09 трлн еўра) прыйшліся на аперацыі ў Deutsche Bank, паведаміла Deutsche Welle. Глабальная інфраструктура гэтага банка выкарыстоўвалася для адмывання грошай на працягу больш доўгага перыяду і ў больш шырокіх маштабах, чым лічылася раней, паведамляюць Sьddeutsche Zeitung і медыякампаніі NDR і WDR. Акрамя таго, сістэмы бяспекі Deutsche Bank не выконвалі свае функцыі, сцвярджаюць следчыя.

Сугучча

Сіла гуманітарнага супрацоўніцтва

Выдавецкі дом «Звязда» і Грамадскі прэс-цэнтр Дома прэсы пры падтрымцы Пасольства Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь правялі круглы стол «Беларусь — Узбекістан: культурныя і гуманітарныя ініцыятывы».

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Сучасныя інтэрнэт-магчымасці дазволілі арганізаваць віртуальную сустрэчу зацікаўленых бакоў. А тое, што зацікаўленасць сапраўды ёсць, пераконвае шырокі ўдзел калег з Ташкента ў абмеркаванні тэмы. Да ўдзелу ў размове прычыніліся: намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Узбекістана Гайрат Мажыд, намеснік галоўнага рэдактара аб'яднанай рэдакцыі часопісаў «Шарк Юлдузі» — «Звезда Востока» Азіз Саід, пісьменнік Кучкор Наркабіл, загадчык аддзела міжнародных літаратурных сувязяў і мастацкага перакладу Рустам Мусурмон, перакладчыца, празаік Рысалат Хайдарава.

Гаворку вялі пра ролю культуры ў захаванні ўзаемапавагі і братэрскага суіснавання народаў Беларусі і Узбекістана, пра ўдзел узбекскіх пісьменнікаў у беларускіх круглых сталах «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго» ў праграме Дзён беларускага пісьменства, штогадовых мінскіх Міжнародных сімпозіумах літаратараў «Пісьменнік і час», пра рэаліі і перспектывы беларуска-ўзбекскіх літаратурных кантактаў і ролю ў іх развіцці мастацкага перакладу, пра вобраз Беларусі ў сучаснай узбекскай літаратуры і Узбекістана ў беларускай. Такія размовы і ўзбагачаюць кожны з бакоў, і дазваляюць узяць нешта на ўзбраенне з пункту гледжання арганізацыі творчай працы, арганізацыі адносін грамадства і творцаў, дзяржавы і творцаў. Па нашай просьбе віртуальны круглы стол пракаментаваў **намеснік дырэктара выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Аляксей ЧАРОТА:**

— Міжнародныя літаратурныя і гуманітарныя стасункі заўсёды прыцягальныя. Нават з пункту гледжання развіцця творчых памкненняў паэтаў, празаікаў, перакладчыкаў. Успомніце гісторыю. Мікалай Гумілёў падарожнічаў у Афрыку. Валерый Брусаў настолькі зрадніўся з Арменіяй, армянскай паэзіяй, што стаў народным паэтам гэтай каўказскай рэспублікі. У трыццатыя Эдуард Самуйлёнак, Барыс Мікуліч падарожнічалі па Грузіі, прывезлі адтуль свае сімпатычныя празаічныя творы. Сёння цяжэй наведваць новыя краіны, цяжэй адкрываць нешта новае асабліва ва ўмовах пандэміі. Але ж так не хочацца губляць напрацаваныя раней сувязі!.. Таму мы і вялі размову — пра тое, што друкаваць, што перакладаць, якія сумесныя выданні мы можам ажыццявіць сёння, як зрабіць так, каб да ўзбекскага чытача новага пакалення паранейшаму даходзіла беларускае мастацкае слова...

Саветнік па палітычных пытаннях Пасольства Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Данияр Абідаў таксама ўдзельнічаў у круглым стале. І вось што ён заўважыў пасля карэспандэнту «Звязды»: «Нам яшчэ і дзеля таго трэба весці дыскусіі, не губляць гуманітарны характар адносін, каб, вырваўшыся праз час з ціскоў пандэміі, пашырыць турыстычны, пазнавальны характар нашых узаемадачыненняў. Каб беларусы з цікавасцю ехалі за ўражаннямі ў Самарканд і Бухару, а ўзбекі адкрывалі Мір, Нясвіж, Белавежскую пушчу, іншыя цуды, адметнасці вашай краіны, яе гістарычнага, геаграфічнага ландшафту...»

Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.

Слова — чытачам «Звязды»

«СЁННЯ ЁСЦЬ ПАТРЭБА Ў ПАДТРЫМАННІ ЛІТАРАТУРНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ»

Іван ШТЭЙНЕР, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Францыска Скарыны, літаратуразнавец, літаратурны крытык, пісьменнік:

— Для мяне як для чытача «Звязды» вельмі важна, што найстарэйшая газета Беларусі ва ўсе часы звяртала пільную ўвагу на літаратурнае жыццё краіны. Менавіта тут друкаваліся мастацкія творы як пачаткоўцаў, так і айчынных класікаў, мелі магчымасць заявіць аб сабе студэнты-філолагі. На старонках «Звязды» выходзілі ў свет лепшыя ўзоры публіцыстыкі. Гэта, безумоўна, спрыяла развіццю літаратурнага працэсу ў нашай краіне. Дракаваліся значныя і аб'ектыўныя рэцэнзіі, прысвечаныя знакавым творам пісьменнікаў Беларусі. Лічу за гонар, што таксама друкаваўся ў найстарэйшай роднай газеце. Сёння ёсць патрэба ў падтрымманні літаратурнай супольнасці, правядзенні на старонках выдання літаратурных конкурсаў, творчых спаборніцтваў. На маю думку, было б вельмі добра, каб гэтыя традыцыі «Звязды» працягваліся і надалей.

Падсілкаваць гаджэт перад цягніком

БЧ устанавіла на вакзалах пункты для бясплатнай зарадкі мабільных прылад.

Як паведамляе прэс-цэнтр магістралі, адпаведнае абсталяванне з'явілася на 19 чыгуначных вакзалах.

У залежнасці ад месца размяшчэння пункту для зарадкі бываюць двух відаў. Стойкі з фірменным афармленнем аснашчаны як разеткамі, так і USB-раздымамі. Дадаткова для зручнасці пасажыраў пад стальніцай стойкі абсталяваныя кручкі для сумак або рукзакоў. На Беларускай чыгунцы звяртаюць увагу пасажыраў, што за захаванасць мабільных прылад і асабістых рэчаў падчас зарадкі адказваюць яны самі.

У прэс-цэнтры БЧ нагадалі, што на чыгуначных вакзалах таксама па-ранейшаму даступная паслуга платнай зарадкі мабільных прылад — калі за невялікія грошы можна пакінуць тэлефон на зарадку пад наглядам работніка вакзала ці ў спецыяльнай ячэйцы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сацыяльны ракурс

РАЗМЕРКАВАЦЬ І ЗАМАЦАВАЦЬ

У сталіцы на першым рабочым месцы застаецца толькі палова маладых педагогаў

У 2019 годзе ў службе занятасці было зарэгістравана ўсяго толькі 530 выпускнікоў усіх відаў навучальных устаноў. Найчасцей дапамога ў працаўладкаванні патрабуецца выпускнікам вышэйшых навучальных устаноў, сярод якіх амаль чвэрць — з кваліфікацыяй «эканаміст» і кожны пяты — з кваліфікацыяй «юрыст». Пра гэта на сустрэчы з журналістамі паведаміў начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.

«Калі казаць аб выпускніках сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, то з іх таксама ў службы занятасці часцей за ўсё звяртаюцца юрысты, эканамісты і бухгалтары. Летась пры садзейнічанні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне было працаўладкавана 412 чалавек, у тым ліку выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі — 140 чалавек, выпускнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 230 чалавек і 42 выпускнікі ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Сёлета па дапамогу ў працаўладкаванні звярнуліся 199 выпускнікоў і 163 чалавекі ўжо працаўладкаваны па атрыманай спецыяльнасці», — запэўніў Алег Токун.

Асноўнымі заказчыкамі кадраў, якія рыхтуюць у БДПУ, з'яўляюцца ўстановы адукацыі Мінска і Мінскай вобласці. Пра гэта паведаміў **прарэктар па вучэбнай рабоце Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Аляксандр МАКОЎЧЫК.**

«Штогод пасля заканчэння ўніверсітэта ў нас размяркоўваецца каля 800 чалавек — усе 100 працэнтаў выпускнікоў. Больш за тое, сёння мы не можам задаволіць усе патрэбы Мінска па спецыяльнасцях «пачатковая адукацыя» і «дашкольная адукацыя», — расказаў прарэктар БДПУ. — Маладым людзям, якія навучаліся на ўмовах аплаты, таксама даецца магчымасць атрымаць першае рабочае месца шляхам размеркавання, праўда, пры наяўнасці свабодных вакансій або індывідуальнага запыту з будучага месца працы. Так, у 2018 годзе выказалі жаданне размеркавацца сем выпускнікоў, якія навучаліся на платнай аснове, летась — чатырнаццаць, у 2020 годзе — тры. А вось выпадкі адмаўлення ад размеркавання — адзінкавыя».

Аляксандр Макоўчык адзначыў, што эфектыўнасць замацавання маладых спецыялістаў шмат у чым залежыць ад дзеянняў мясцовых органаў улады, кіраўнікоў устаноў адукацыі, прафсаюзных камітэтаў, ад той ступені падтрымкі, якую ім аказваюць на першым рабочым месцы, ну і, канешне, ад унутранай матывацыі. На бюджэтнай аснове ва ўніверсітэце штогод навучаецца 870 студэнтаў. Каля 200 з іх — гэта выпускнікі педагагічных класаў, якія зрабілі выбар свядома, бо ўжо знаёмыя з усімі нюансамі прафесіі педагога. Яшчэ каля 200 чалавек заключаюць мэтавыя дагаворы на навучанне. І тыя, і другія пасля заканчэння вучобы павінны будуць адпрацаваць пяць гадоў на тым месцы, куды іх накіруюць.

«Забеспячэнне працоўных і сацыяльных правоў і інтарэсаў работнікаў, у тым ліку маладых спецыялістаў, вучнёўскай моладзі, падтрыманне стабільнай работы калектываў з'яўляецца адной з галоўных нормаў галіновага пагаднення, заключанага паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі, — паведаміла **загадчык аддзела арганізацыйнай работы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аксана ВАСІЛЕВІЧ.** — Прадстаўнікі прафсаюза прымаюць актыўны ўдзел у размеркаванні маладых спецыялістаў, аказваюць садзейнічанне ў вырашэнні жыллёвых пытанняў, даюць юрыдычную кансультацыю, а таксама аказваюць кансультацыйную падтрымку і прававую дапамогу ў перыяд адпрацоўкі. Дарэчы, па інфармацыі галіновага прафсаюза, паказчык замацавання педагагічных кадраў пасля двух гадоў адпрацоўкі вагаецца па краіне ў межах 75—80 працэнтаў. Самы нізкі паказчык — у Мінску, дзе на першым рабочым месцы застаюцца толькі 50 працэнтаў педагогаў. А самы высокі — у Брэсцкай вобласці (90 працэнтаў).

Не можа быць!

Студэнтамі БДУ сталі трайняты

Ва ўніверсітэце не могуць прыгадаць падобнага выпадку за апошнія гады. Сюды на першы курс факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі паступілі члены адной сям'і — трайняты Алена, Віталь і Аляксей Гімбіцкія.

Фота прэс-службы БДУ.

Усе яны з залатымі медалямі скончылі Глыбоцкую раённую гімназію і неаднаразова станавіліся прызёрамі раённых і абласных прадметных алімпіяд. Пры выбары факультэта кіраваліся яго прэстыжнасцю і падрыхтоўкай там высокакваліфікаваных спецыялістаў для ІТ-галіны.

У якасці абітурыентаў Віталь набраў 387 балаў, Аляксей — 373 і Алена — 383. Пры гэтым па матэматыцы ў Віталя 100 балаў, а ў Аляксея і Алены па 98 балаў.

Усе паступілі на «бюджэт» і выбралі спецыяльнасць «інфарматыка». Зараз яны навучаюцца ў адной групе. Дарэчы, пра ФПМІ даведаліся падчас удзелу ў Рэспубліканскай летняй навукова-даследчай школе вучняў і настаўнікаў. Прафарыентацыйнае мерапрыемства традыцыйна арганізуецца ў летні перыяд і дазваляе школьнікам у рамках навуковых семінараў і практычных заняткаў паглыблена вывучыць абраныя дысцыпліны.

Зараз браты і сястра адаптуюцца ва ўніверсітэце і студэнцкім інтэрнаце, з цікавасцю вывучаюць новыя прадметы. У будучыні ўсе трое плануюць звязаць сваё жыццё з ІТ-тэхналогіямі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДОМ «ПАД КЛЮЧ», або Зборны канструктар

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Начальнік аддзела адзначыла, што летась у Беларусі ўведзена ў эксплуатацыю 4 мільёны 690 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы жылля, з іх адзін мільён 770 тысяч — у індывідуальным выкананні (43 % ад агульнай колькасці ўведзенага ў эксплуатацыю жылля). З іх амаль 324 тысячы квадратных метраў было пабудавана ў Брэсцкай вобласці, больш за 118 тысяч — у Віцебскай, больш за 205 тысяч — у Гомельскай, звыш 165 тысяч — у Гродзенскай, амаль 790 тысяч — у Мінскай і больш за 131 тысячу квадратных метраў — у Магілёўскай вобласці. Звыш 37 тысяч «квадратаў» індывідуальнага жылля было ўведзена ў 2019 годзе ў сталіцы.

На гэты год у краіне вызначана заданне пабудаваць чатыры мільёны квадратных метраў жылля, з іх адзін мільён 600 тысяч квадратных метраў індывідуальнага жылля (40 % ад агульнай колькасці).

rem-dom-stroy.ru

Па словах прадстаўніка міністэрства, ёсць надзея, што асобныя вобласці могуць нават перавыканаць гэты план. Так, актыўна развіваецца індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва ў Мінскай вобласці. Тут сёлета плануюць узвесці 700 тысяч квадратных метраў такога жылля. Далей у рэйтынгу ідуць Брэсцкая вобласць (300 тысяч «квадратаў») і Гродзеншчына (176 тысяч). Адзначаецца, што ў астатніх абласцях попыт ёсць, але ён не такі высокі.

— Мы спадзяёмся, што ў абласцях перавыканаюць даведзеныя заданні і пабудуюць яшчэ больш індывідуальных жылых дамоў, — удакладніла Кацярына Усянкова.

У сваім выступленні прадстаўнік Мінбудархітэктуры злёгку закранула тэму крэдытавання жылля для насельніцтва. Так, сёння ў гэтай галіне існуюць пэўныя праблемы. Крэдыты пад будаўніцтва або куплю нерухомасці не выдаюцца. Але, упэўнена Кацярына Усянкова, гэтыя абмежаванні часовыя. Акрамя таго, па тых дагаворах, якія ўжо дзейнічаюць, ніякіх прыпыненняў або зрываў не адзначаецца.

І пабудуюць жыллё роўнымі радамі...

Прадстаўнікі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва падзяліліся планамі арганізаванай забудовы.

«У міністэрстве разлічваюць, што ў будучыні атрымае развіццё комплексная забудова, — кажа Кацярына Усянкова. — Такі спосаб дазваляе забудоўшчыку ўзяць не адзін-два зямельныя ўчасткі, а ахапіць сапраўды вялікую тэрыторыю».

Такія пляцоўкі забудоўваюць УКБ або домабудаўнічыя камбінаты, а пасля яны ж прапануюць грамадзянам набыць той ці іншы дом «пад ключ». Вядома, распрацоўшчыкі праекта мяркуюць, што гэта будуць не проста жылыя дамы, а забудоўшчык паклапоціцца і аб сацыяльнай інфраструктуры — дзіцячых садках, школах, гандлёвых аб'ектах. У ідэале такая забудова будзе комплекснай. Чакаецца, што ўжо сёлета будзе ўведзена ў эксплуатацыю 10 тысяч квадратных метраў такога жылля.

Напрыклад, масава будаваць індывідуальныя дамы дзеля далейшага продажу ўзяўся Салігорскі ДБК. «У перспектыве тэма індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва для нашага прадпрыемства вельмі цікавая для рэалізацыі новых ідэй. Аднак пакуль мы робім толькі першыя крокі, — сказаў **галоўны інжынер ААТ «Салігорскі домабудаўнічы камбінат» Дзмітрый РУСАКОЎ.**

У гэтым годзе намаганнямі прадпрыемства ўведзены ў эксплуатацыю шэсць індывідуальных жылых дамоў для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Праекты былі распрацаваныя інстытутам «Салігорскпраект», які ўваходзіць у структуру домабудаўнічага камбіната.

Усяго прадпрыемства мае два варыянты праектаў дамоў, якія ўвялі ў эксплуатацыю ў Нясвіжскім раёне (пяць дамоў) і Салігорскім (адзін дом), — на 96 квадратных метраў і 128,8 квадратнага метра. Характэрна, што сабекошт будаўніцтва дома агульнай плошчай амаль 130 «квадратаў» з унутранымі інжынернымі сеткамі без аздаблення склаў 1086 рублёў за квадратны метр. За будаўніцтва ўсяго дома чаргавікам (па Указе № 240) прыйшлося заплаціць 140 тысяч рублёў.

Кошт будаўніцтва меншага дома агульнай плошчай 96 квадратных метраў склаў 1243 рублі за квадратны метр.

Дзмітрый Русакоў таксама расказаў, што прадпрыемства распрацоўвае схему комплекснай малапавярховай жылой забудовы, якая зойме 28 гектараў зямлі. Гэты праект з'яўляецца дастаткова перспектыўным, так як яго землі непасрэдна прымыкаюць да гарадскіх тэрыторый. Гэта азначае, што няма неабходнасці ўзводзіць дадатковыя дзіцячыя садкі і школы. З часам гэтую жылую забудову плануюць унесці ў межы горада. «Пакуль намі вядуцца перагаворы аб выдзяленні зямельнага ўчастка з Салігорскім райвыканкамам, але ў выніку спадзяёмся рэалізаваць праект, — удакладніў галоўны інжынер домабудаўнічага камбіната.

«Індывідуалцы» загадана расці хутчэй

Што датычыцца планаў на наступны год, то, па словах Кацярыны Усянковай, аб'ёмы індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва памяншацца не будуць. «Мы прапануем абласцям пабудаваць у наступным годзе каля 1,8 мільёна квадратных метраў індывідуальнага жылля, сюды ўвойдуць і аб'ёмы комплекснай забудовы. Прапрацоўваецца таксама пытанне па давядзенні павышанага задання на 2021 год агульнага ўводу жылля ў памеры 4,1 мільёна квадратных метраў, але гэтыя заданні будуць яшчэ зацвярджацца ўрадам. Ужо вядзецца прапрацоўка пытання з аблвыканкамамі, і меркаванне чыноўнікаў на месцах будзе ўлічвацца. Пакуль урад не зацвердзіў гэтыя планы, але прадстаўнікі Мінбудархітэктуры ўпэўненыя: будаўніцтва — лакаматыў эканомікі, і жыллёвы сектар здольны ёй сур'ёзна дапамагчы.

Дом «навыраст» і дом-канструктар

Праектны інстытут «НікаПраект» у сферы індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва працуе як з дзяржаўнымі, так і з прыватнымі заказчыкамі. **Галоўны архітэктар прадпрыемства Дзяніс КУЛЬГАВЫ** расказаў, што інстытут, у прыватнасці, распрацоўвае цікавы праект пад назвай «Дом навыраст». Калі маладая сям'я на дадзеным этапе не жадае/не можа будаваць больш габарытнае жыллё, ёй прапануецца ўзвесці такое жыллё, якое з цягам часу магчыма без праблем мадэрнізаваць.

«Мы прапануем чалавеку пабудаваць дом плошчай 96 квадратных метраў з магчымасцю ў любы час надбудаваць другі мансардны паверх. Дабудоўваць дадатковы паверх можна нават праз 5 або 10 гадоў. Акрамя дома, праектам прадугледжана будаўніцтва гаспадарчых пабудоў і двух парковачных месцаў», — удакладніў Дзяніс Кульгавы.

У адным з дадатковых кірункаў дзейнасці РУП «Завод газетнай паперы» спецыялізуецца на драўляным домабудаванні (выключна). Гэта каркасна-панэльныя, фахверкавыя дамы і дамы з клеенага бруса.

У мінулым годзе асобная вытворчасць завода выраблена і экспартавала 25 домакамплектаў у Францыю, Японію і іншыя краіны. У цяперашні час заказы, выкананыя прадпрыемствам у сакавіку, на жаль, яшчэ не адгружаныя ў Славакію і Данію. Гэта звязана з тым, што спецыялісты завода аказваюць паслугі і па мантажы сваіх дамоў. А ім уезд у краіны ЕС забаронены. «Каранцін прадоўжаны да кастрычніка гэтага года, — паведаміў **намеснік дырэктара па капітальным будаўніцтве завода Аляксей МАЛЧАНАЎ.** — Таму нам прыйшлося пераарыентавацца на ўнутраны рынак».

Сёння завод прапануе тыпавы праект агульнай плошчай 90 квадратных метраў з магчымасцю надбудовы мансардная паверха да 150 квадратных метраў.

Таксама рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства працуе па Указе № 240 і будуе дамы для грамадзян, якія маюць патрэбу ў жыллі. У цяперашні час кошт будаўніцтва дома плошчай 151 квадратны метр з гаспадарчымі пабудовамі, інжынернай інфраструктурай, абсталяваннем, унутраным і вонкавым аздабленнем складае 1680 рублёў за квадратны метр, або прыкладна 253 тысячы рублёў за аб'ект. Дом атрымліваецца цалкам драўляны, утульны і цёплы. Але дарагі. Такое жыллё прапанавана чаргавікам у Шклоўскім раёне. Будаўніцтва драўлянага дома «пад ключ» займае паўтара месяца.

Акрамя таго, прадпрыемства вырабляе і пастаўляе домакамплекты для сельскагаспадарчых арганізацый Віцебскай вобласці. Праект быў распрацаваны на 150 дамоў, але з-за праблем з фінансаваннем да канца гэтага года прадугледжана пабудаваць і ўвесці ў эксплуатацыю 27 дамоў.

Сумесна з Інстытутам «Магілёўжылпраект» заводам распрацоўваецца і пілотны праект 8-кватэрнага жылога дома з каркасна-драўляных канструкцый. Але драўляны блочны дом гэтага праекта на сённяшні дзень мае вельмі вялікі каштарысны кошт. Зараз спецыялісты завода працуюць над патанненнем сабекошту будаўніцтва.

«Хочам зрабіць таннейшым такое будаўніцтва, таму будзем працаваць з іншымі праектнымі інстытутамі. Наша задача — у наступным годзе ўсё ж рэалізаваць праект, тым больш што ДБК прапануюць мінімум 40-кватэрныя дамы, а ў нас атрымаецца стварыць хутка-ўзведзенае жыллё для чатырох ці васьмі сем'яў, — адзначыў Аляксей Малчанаў. Па яго словах, мантаж камплекта дома на гатовы падмурак займае каля васьмі рабочых дзён.

Многія звяртаюцца на прадпрыемства, каб не толькі купіць дом для жылля, але і набыць пабудову для дачы. Сярэдні дом плошчай 60 квадратных метраў без мантажу, вокнаў і дзвярэй — свайго роду зборны канструктар — каштуе 300—350 рублёў за «квадрат». Мантаж — 25—30 % ад кошту ўсяго аб'екта.

Сяргей КУРКАЧ.

Чулі?

Амерыканскі рэпер узводзіць свой горад будучыні ў Сенегале

Горад будуюць за 100 кіламетраў ад Дакара, сталіцы Сенегала. Амерыкана-сенегальскі рэпер і бізнесмен Эйкан Тыям, які выступае пад псеўданімам Akon, натхняўся Вакандай — выдуманай афрыканскай краінай з блокбастара «Чорная пантэра». У ёй жывуць супергероі сусвету Marvel. Кінапраект стартаваў у 2018-м, праз два гады быў закладзены першы камень Эйкан-сіці. «Толькі што заключылі пагадненне для будаўніцтва Akon City ў Сенегале. Будзем рады прыняць вас там у будучыні», — напісаў хіп-хоп-выканаўца ў «Твітэры».

Чакаецца, што горад з'явіцца ў раёне прыморскага пасёлка Мбадзьен. Тэрыторыю плошчай 800 гектараў бізнесмену падарыў прэзідэнт Сенегала Макі Салі. Эйкан-сіці стане працаваць на сонечнай энергіі. Горад будуць атачаць штучныя астравы і экалагічныя курорты. Ён размесціцца ў пяці хвілінах руху ад аэрапорта, а таксама яго аснасцяць усёй неабходнай інфраструктурай. Унутры плануюць узвесці порт для круізных суднаў, хмарачосы з апартаментамі і бізнес-цэнтрамі, гандлёвыя цэнтры, кандамініумы, бальніцу, школу, універсітэт. Эйкан таксама паабяцаў, што да Эйкан-сіці можна будзе дабрацца за 1-2 гадзіны з любога пункта Афрыкі. Пры гэтым звычайны пералёт з Найробі ў Дакар займае больш за дзесяць гадзін. Расплачвацца жыхары і госці змогуць спецыяльнай лічбавай валютай AKoin.

Будаўніцтва плануюць завяршыць да 2023 года пры падтрымцы ўрада Сенегала. Улады разлічваюць, што гэта дапаможа прыцягнуць у краіну інвестыцыі. Сам жа Эйкан заяўляе, што горад адкрые новыя магчымасці для ўсіх афраамерыканцаў. Кошт праекта ацэньваюць у шэсць мільярдаў долараў, і, па словах стваральніка, трэць сумы ад інвестараў яны ўжо атрымалі. У будучыні плануюць прадаваць канцэпцыю Эйкан-сіці па мадэлі франшызы, спадзеючыся, што гэта «вызначыць новую парадыгму дызайну і архітэктуры для Афрыкі», паведаміў rbc.ru.

Эйкан нарадзіўся ў ЗША, у сям'і сенегальцаў. Ён жыў у Сенегале да сямі гадоў. Потым сям'я пераехала ў ЗША. Эйкан актыўна выступае ў падтрымку бедных афрыканскіх краін, якія цалкам залежныя ад Захаду. Эйкан-сіці — не першы амбіцыйны праект зоркі R&B. У 2014 годзе ён абвясціў аб стварэнні дабрачыннай ініцыятывы Lighting Africa («асвятліць Афрыку»), сумесна з Samba Bathily і Thione Niang. Яе мэтай было забяспечыць афрыканскія гарады сонечнай энергіяй. Для гэтага планавалі пабудаваць аўтаномныя электрастанцыі і ўстанавіць на вуліцах ліхтары. Як сцвярджаюць стваральнікі праекта, ён дапамог больш як 32 мільёнам чалавек у 25 краінах.

У 2018 годзе Эйкан запусціў Akoin — уласную крыптавалюту, прывязаную да смартфонаў праз спецыяльную праграму. Яна павінна была аб'яднаць афрыканскіх прадпрымальнікаў і стаць самай «стабільнай альтэрнатыўнай валютай па ўсёй Афрыцы». Аднак ужо на першым этапе праект сутыкнуўся з непераадольнымі цяжкасцямі: у большасці афрыканцаў вельмі нізкі ўзровень даходаў, а смартфоны ёсць толькі ў трэці насельніцтва.

«Я лічу вар'яцтвам, маючы мільярд долараў, захоўваць яго ў банку, калі вакол столькі людзей, якія маюць патрэбу ў дапамозе», — пракаментаваў свае ініцыятывы рэпер.

Сямнаццаць вярнуліся з небыцця...

Вось яно перад намі, мірнае і ціхае, з аднаго боку ад якога траса Слаўгарад – Доўск — старая Варшаўка, з другога — рака Сож. Зусім нядаўна тут каласілася пшаніца, а зараз тырчыць калючы ржэўнік. Але ў ліпені 1941-га тут быў зусім іншы пейзаж. Менавіта ў гэтым месцы 25-ы мехкорпус павінен быў прыкрыць правы фланг і прыняць фашысцкі ўдар на сябе. 21-я армія вяла контрнаступленне ў раёне Рагачова і Жлобіна і 12 ліпеня ўпершыню з пачатку вайны вызваліла два гэтыя раёны. Пакуль чырвонаармейцы стрымлівалі фашыстаў пад Прапойскам (сённяшні Слаўгарад), 63-і корпус Рыгора Пятроўскага паспрабаваў адбіць у немцаў Бабруйск. Але аперацыя па вызваленні сарвалася. Захопнікі значна ўзмацнілі свае пазіцыі — яны падцягвалі ўсё новыя і новыя сілы. А 14 ліпеня матарызаваныя калоны Гудэрыяна захапілі Прапойск.

Пад Прапойскам нямецкі генерал ледзь не трапіў у палон

Да экспедыцыі ў Слаўгарадскім раёне пошукавікі абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру» разам з прадстаўнікамі 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна паспелі папрацаваць у Буйнічах у Магілёўскім раёне, а таксама ў Быхаве і Чавусах. У апошнім месяцы яны падняслі 17 байцоў і знайшлі медаль «За адвагу». Па ім устанавілі імя байца 1905 года нараджэння з Іванаўскай вобласці Івана Кузняцова. Але на пошукі пад Слаўгарадам у ваенных археолагаў першапачаткова былі вялікія надзеі.

— Гэта поле пад Слаўгарадам вельмі цікавае, — кажа **заснавальнік і кіраўнік клуба Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Па гэтым месцы дакументы ў нас былі яшчэ з 1995 года. Я тады вывез з Падольскага архіва ўсё, што ёсць па 25-м мехкорпусе генерала Сямёна Крывашэіна. Таго самага, які 23 верасня 1939 года ў Брэсце разам з Гудэрыянам прымаў парад нямецкіх і савецкіх войскаў, а ў ліпені 1941 года ўжо пад Прапойскам танкісты Крывашэіна ледзь не ўзялі ў палон гэтага генерала. На жаль, ён збег, пакінуўшы сваю асабістую машыну. Сёлета мы ўпершыню зачапіліся за гэтае месца. Мы ўдзячныя нашым байцам Паўлу Кончыкаву і Ягору Шчанаву, якія неаднаразова выязджалі сюды на разведку, размаўлялі з мясцовымі жыхарамі, «прывязвалі» да гэтага поля нямецкую аэрафотаздымку.

На Слаўгарадскі раён у пошукавікаў адведзены два дні, і яны імкнуцца выкарыстаць іх як мага больш прадукцыйна. Нават калі паліў дождж, найбольш упартыя неахвотна пакідалі свае пазіцыі.

У камандзе спрэс вопытныя пошукавікі. Некаторыя працуюць сем'ямі. Як Ала і Яўген Бацанавы. Яўген адпрасіўся з работы, каб прыняць удзел у слаўгарадскай экспедыцыі, а перад гэтым дзеля пошукаў у Чавускім раёне ахвяраваў сваімі выхаднымі. І такіх апантаных шмат...

Перакапаць усё поле сіламі «Віккру» немагчыма, таму вельмі важна як мага дакладней вызначыць раскопкі. На кожным працуе па 2-3 чалавекі. Загінулыя ляжаць амаль на паверхні — глыбіня 50–70 сантыметраў. Дзіўна, што калгасная тэхніка за столькі гадоў іх не зачапіла.

— За Прапойск пасля таго, як яго ўзялі немцы, яшчэ цэлы месяц ішлі баі, але безвынікова — захопнікі яго так і не здалі, — кажа Мікалай Барысенка. — Нашых салдат тут палягло страшэнна шмат. Вакол Прапойска ваявалі байцы 219-й механізаванай дывізіі генерал-маёра Паўла Корзуна, 42-й стралковай дывізіі Івана Лазарэнкі, 6-й стралковай дывізіі Міхаіла Папсуй-Шапко, 55-й стралковай дывізіі палкоўніка Геворка Тэр-Гаспарана, 50-я танкавая дывізія. Мы тут знаходзілі абпаленыя дэталі падбітых савецкіх машын. Дывізія была часткова ўкамплектаваная найноўшымі Т-34. На жаль, падрыхтоўка савецкіх танкістаў была не самай лепшай, у некаторых наезд складаў усяго 5–6 гадзін. У немцаў механікі наязджалі не менш за 100 гадзін. Яны былі ўжо прафесіяналы, якія маглі манеўраваць.

Надзея на медальён

Гэта ўласна тое, дзеля чаго і працуюць пошукавікі. Для іх вельмі важнае нават адно імя, вырванае з небыцця. Медальён, дарэчы, — асноўная прыкмета пачатку вайны. У 42-м іх ужо адмянілі.

Раптоўна цішыню над калгасным полем праразае крык. Гэта значыць, што першы медальён ёсць. Шчасліўчык — камандзір пошукавай групы «Сірыус» Ягор Шчанаў. Усе бягуць да яго. Ягор зачапіў прыборам падсумак яшчэ падчас разведкі гэтага месца. І не памыліўся. Побач з астанкамі байца і яго амуніцыяй ляжаў і медальён. Знойдзена таксама некалькі «кубікаў» — знакаў адрознення, гэта значыць, што загінулы быў як мінімум малодшым лейтэнантам.

Хутка раздаецца яшчэ адзін крык. На гэты раз знайсці медальён пашчасціла Аляксандру Юрчыну і Дзмітрыю Паклонскаму з «Дняпроўскага рубяжу».

У завуча 34-й школы Галіны Бяляевай і супрацоўніка магілёўскага інстытута МУС Аляксея Цюцюнкова наогул нестандартная знаходка — нейкая скрыначка. А што калі там дакументы? Аказалася — партсігар з тытунём. І захаванасць адменная. На пакрыўцы малюнак — тэніснай ракетка. Вельмі верагодна, што салдат у мірным жыцці займаўся гэтым відам спорту. Медальён ёсць, але зламаны. На жаль даведацца імя ўжо не атрымаецца.

А што пад накрыўкай?

Антон Пракапнёў разам з Сяргеем Тагаевым дастаюць з зямлі компас, гадзіннік, процівагаз. Мяркуючы па амуніцыі, імі знойдзены баец з ліку камандзіраў.

— Компас, камандзірская сумка — гэты набор не характэрны для радавога складу, — кажа Антон. — Медальён жа сведчыць, што гэта малодшы камандзір. У камандзіраў сярэдняга звяна медальёны былі вельмі рэдка. Салдат знойдзены ў варонцы, хутчэй за ўсё, загінуў ад выбуху. Сярод астанкаў дробныя асколкі. На гадзінніку час прыпыніўся на 15 хвілінах на дзявятую.

Эксгумацыйныя банеры каля раскопаў хутка запаўняюцца астанкамі салдат. Пошукавікі беспамылкова могуць расказаць пра кожнага байца, растлумачыць, як той загінуў.

— Раней косткі перабіралі наўздагад, не ўсе ж анатомію ведаюць, — кажа Мікалай Барысенка. — З гэтымі банерамі стала нашмат прасцей. Імі карыстаюцца і нашы расійскія і ўкраінскія калегі.

Работа амаль ювелірная — пэндзлі, скрабкі, губкі. Партупеі, косці, каскі ляжаць уперамешку. Байцоў пошукавікі збіраюць, лічы, па «дэталях». Асобна складваюцца іх рэчы.

Манеткі, штык-нож, наган, нават пласкагубцы — знаходак шмат. Але самыя каштоўныя — падпісаныя, іх, на жаль, адзінкі. Той жа компас, які знайшлі Антон Пракапнёў і Сяргей Тагаеў. На наступны дзень Павел Кончыкаў доўга круціў яго ў руках, углядваючыся ў ініцыялы на вечку — тры літары «І». І раптам убачыў збоку прозвішча цалкам — Ільін. Гэта было неверагодна. Прабілі па базах і высветлілі, што гэта Іван Ільіч Ільін з Марыйскай АССР! А ў лінзе ад процівагаза быў знойдзены ліст байца да родных. Гэта таксама было фантастычна, бо звычайна на гэтым месцы ляжыць інструкцыя. А тут такі незвычайны паварот. Напамін пра тое, што гісторыя патрабуе ўважлівасці. Пашчасціла таксама знайсці кацялок з надрапаным на ім прозвішчам. Зараз байцы клуба актыўна займаюцца пошукам інфармацыі пра гэтага чалавека.

— На гэты раз нам асаблівым чынам шчасціла, — задаволена вынікамі экспедыцыі **начальнік штаба клуба, метадыст абласнога Цэнтра творчасці Святлана БАРЫСЕНКА.** — Быццам нейкая невядомая рука паказвала, дзе шукаць. Толькі па Слаўгарадскім раёне за два дні раскопак былі падняты астанкі 18 байцоў і знойдзена восем медальёнаў. Так што невядомых герояў вайны стала на некалькі чалавек менш.

Патрыятызм выхоўваецца ў палявых умовах

Паназіраць за работай пошукавікаў і аказаць ім дапамогу па чарзе прыязджалі са сваімі выкладчыкамі навучэнцы слаўгарадскага прафесійнага ліцэя, а таксама старшакласнікі першай і другой школ Слаўгарада і школы з вёскі Васькавічы.

— Мой прадзед Васіль быў артылерыстам, — з гонарам паведаміў слаўгарадскі школьнік **Стас АКСЁНАЎ.** — І мне цікава дакрануцца да ваеннай гісторыі.

— У Слаўгарадскім раёне выходзіла з акружэння 137-я стралковая дывізія, якая была сфарміраваная ў Горкаўскай вобласці, а мая маці родам з Ніжняга Ноўгарада — былога Горкага, — кажа **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце СШ № 2 Слаўгарада Наталля ПАХОМАВА.** — Арзамасаўскія пошукавікі неаднаразова прымалі ўдзел у сумесных вахтах памяці на тэрыторыі раёна. І я адчуваю, як моцна нас звязала гэта зямля.

Слаўгарадскі пошукавік Аляксандр Халееў заўважае, што патрыятызм лепш за ўсё выхоўваецца ў палявых умовах. Калі падлеткі на свае вочы бачаць непрыкрытую нічым праўду вайны, якая выглядае са зробленых пошукавікамі раскопаў. Не выключана, што кагосьці гэта па-сапраўднаму зацягне і ён пажадае стаць ваенным археолагам. А гэта, лічы, ужо на ўсё жыццё. Некаторыя ў дадзеным руху ўдзельнічаюць з дня яго ўтварэння — больш за 20 гадоў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара і Святланы БАРЫСЕНКІ,
Слаўгарадскі раён.

Байца прыходзіцца збіраць па «запчастках».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Камунальныя стасункі

НЕ ЗАПЛАЦІШ — ЗАМЕРЗНЕШ

Што чакае сёлетняй зімой спажыўцоў жыллёвых паслуг

Сёлета тэрмін пачатку ацяпляльнага сезону ў краіне цалкам залежыць ад рашэння мясцовых органаў улады. Камунальнікам толькі паведамяць пра падключэнне. Спецыялісты ЖКГ тым часам сочаць за нарыхтоўкай паліва на зіму і станам абсталявання, а таксама аплатай камунальных паслуг, за пратэрміноўку якой нават на адзін дзень можна адразу стварыць выканаўчы надпіс. А праз два месяцы адлучыць кватэру ад усіх выгод: газа-, цеплазабеспячэння, святла і нават каналізацыі. Як краіна рыхтуецца да зімы, на прэс-канферэнцыі ў БелТА расказалі айчынныя камунальнікі і энергетыкі.

Пашпарты гатоўнасці

Да 30 верасня ўсе цеплакрыніцы краіны, якія абслугоўвае Мінжылкамгас, атрымаюць пашпарты гатоўнасці да работы ў асенне-зімовы перыяд. Адпаведныя дакументы маюць ужо 98,9 % такіх аб'ектаў. Ёсць пашпарты гатоўнасці і ў амаль 83 % аб'ектаў жылфонду Беларусі, для якіх гэта бадай што асноўны паказчык гатоўнасці да ацяпляльнага сезону. Пры гэтым сталіца, Гомельская, Брэсцкая і Гродзенская вобласці «пашпартызаваны» на 100 %. У Мінскай вобласці без пашпартоў пакуль 33 аб'екты, у Магілёўскай — сем, у Віцебскай — чатыры.

— Сёння фактычна ўсе мерапрыемствы, якія прадугледжаны для атрымання пашпартоў гатоўнасці, выкананы. У прыватнасці, праформант сістэм ацяплення цеплавузлоў, гідраўлічныя іспыты сістэм ацяплення і іх апрэсоўка выкананы на 100 %, — падзяліўся лічбамі **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і СМІ Міністэрства ЖКГ.** — Засталося дарамантаваць нязначную частку даху (выканана ўжо 97,6 %) і сценавых панэляў (зроблена 99,2 %), а таксама праверыць прыборы ўліку цеплавой энергіі (96,8 % з іх ужо прайшлі гэтую працэдуру).

У сталічнай вобласці пашпарты гатоўнасці атрымалі 73 % спажыўцоў энергіі і 80,3 % цеплакрыніц. Спецыялісты працуюць і ў выхадныя дні, так што да 30 верасня пашпарты атрымаюць усе, удакладніла **Таццяна МУЗОК, начальнік аддзела энергетыкі і паліва ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі, энергетыкі і паліва Мінаблвыканкама.**

Каб своечасова зарэгістраваць пашпарты гатоўнасці, без выхадных працуе і персанал філіялаў Дзяржэнергагазанагляду, сцвярджае **Аляксандр АЗЯРЭЦ, генеральны дырэктар установы «Дзяржаўны энергетычны і газавы нагляд»:**

— Зарэгістраваны 25 013 пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў цеплаэнергіі (87,1 %) з 28 731, якія неабходна аформіць, а таксама 9426 пашпартоў гатоўнасці цеплакрыніц (89,1 %) з неабходных 10 579. Гатовыя 423 пашпарты гатоўнасці спажыўцоў цеплаэнергіі (95,9 %) і 256 пашпартоў гатоўнасці цеплакрыніц (97,3 %) арганізацый Мінэнерга.

Да 25 верасня будуць мець пашпарты гатоўнасці і ўсе цеплакрыніцы арганізацыі «Белтапгаз». Пакуль іх атрымалі 98 % аб'ектаў.

Аварыйныя брыгады і перасовачныя кацельныя

Рыхтуючыся да зімы, камунальнікі сфарміравалі 752 аварыйна-аднаўленчыя брыгады. Падрыхтавалі да працы 15 перасовачных модульных кацельных і правялі планавыя трэніроўкі па іх разгортванні ва ўмовах, максімальна набліжаных да тых, якія могуць скласціся падчас надзвычайных сітуацый на кацельных і цепласетках. Напагатове таксама 570 аўтаматычных перасовачных крыніц электразабеспячэння, расказала **Святлана ЦІМОШКІНА, намеснік начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства ЖКГ:**

— У цэлым аб'екты гатовыя да работы ў асенне-зімовы перыяд. Ад гадавога задання па замене цепласетак выканана 74 %. Поўнасцю нарыхтаваны запасы драўнянага паліва. Для ўтрымання вулічна-дарожнай сеткі гатовыя 3903 адзінкі снегаўборачнай тэхнікі, нарыхтавана 241 тысяча тон пясчана-саляной сумесі. Кожны тыдзень кантралююцца аб'екты ЖКГ па 12 асноўных паказчыках і штомесяц — па 89 іншых паказчыках, якія гарантуюць надзейнае, беззаварыйнае і бесперабойнае цепла- і водазабеспячэнне жылога фонду, а таксама забеспячэнне функцыянавання ўсёй інфраструктуры гарадскіх і сельскіх пунктаў краіны падчас ацяпляльнага перыяду.

У штатным рэжыме рыхтуецца да зімы і Міншчына. 86 % аб'ектаў цеплавой гаспадаркі вобласці і 99,8 % — водаправодна-каналізацыйнай гатовыя да зімы. Жыллёвы фонд падрыхтаваны на 99,7 %, расказала Таццяна Музок:

— Поўнасцю створаны запасы паліўнага мазуту. Нарыхтавана 83 % драўнянай шчапы, 75 % торфабрыкету. Да першага кастрычніка ўсё будзе выканана на 100 %.

Сёлета на айчынных тарфяніках здабыта 1691 тысяча тон торфу, а работнікі Белпалівагазу гатовыя цалкам забяспечыць патрэбы прамысловасці і насельніцтва ў гэтым паліве, падзяліўся **Дзмітрый ШАЎЛОЎСКІ, першы намеснік генеральнага дырэктара ДВА «Белпалівагаз»,** і нагадаў насельніцтву, што «ацяпляльны перыяд неўзабаве пачынаецца, і час рабіць заяўкі і набываць неабходнае паліва».

Паўгода, два месяцы ці адзін дзень?

Адмова ад аплаты жыллёва-камунальных паслуг — дэструктыўная перш за ўсё для самих спажыўцоў, упэўнены Генадзь Аксціловіч, які пракаментаваў заклікі не аплачваць «камуналку», што з'явіліся ў інтэрнэце:

— Аплачваючы жыллёва-камунальныя паслугі, вы аплачваеце паслугі прадпрыемства ЖКГ, якое вам іх аказала ў бягучым месяцы. Адпаведна, у наступным месяцы вы не можаце разлічваць, што ў пад'ездзе своечасова заменяць лямпачку, прыбяруць ці ў час прыедзе аварыйная служба. Заканадаўчыя нормы таксама досыць жорсткія і пачынаюцца фактычна з першага ж дня неаплаты. Гэта, па-першае, пеня (0,3 % ад сумы запазычанасці) за кожны дзень пратэрміноўкі. Па-другое, арганізацыі ЖКГ маюць магчымасць афармлення выканаўчага надпісу. Ён афармляецца фактычна ў безумоўным парадку на падставе звестак арганізацыі ЖКГ. Потым ён будзе перададзены судовым выканаўцам, якія ў сваю чаргу маюць комплекс мер, каб спагнаць запазычанасць. Сярод такіх мер — пазбаўленне права кіравання аўто, забарона выезду за мяжу, могуць нават скласці вопіс маёмасці і нерухомасці.

Ужо з двух месяцаў пратэрміноўкі камунальнікі маюць права адключыць неплацельшчыкам ваду, газ, свет, цяпло і нават каналізацыю. А праз паўгода справа можа дайсці да высялення з кватэры ці адчужэння нерухомасці, калі яна прыватная.

— Прафілактычную работу з неплацельшчыкамі, вядома, ніхто не адмяняў, і трэба глядзець па сітуацыі, перш чым жорстка караць. Калі ў ЖЭС адзін-два такіх, можа, у людзей складаная жыццёвая сітуацыя. А калі масава не заплацяць — справа іншая, і меры рэагавання будуць больш жорсткія, — удакладніў спецыяліст.

Для дзяцей — плюс дзесяць, для астатніх — ад васьмі і ніжэй

Адпаведна сёлетняй пастанове Саўміна № 286 аб зацвярджэнні правілаў падрыхтоўкі арганізацый да ацяпляльнага сезону, яго правядзенні і завяршэнні, рашэнне аб тэрмінах пачатку і завяршэння ацяпляльнага сезону прымаецца абласнымі, раённымі, выканкамамі на падставе звестак аб сярэднесутачнай тэмпературы на вуліцы па абласцях. Узгадненне Мінжылкамгаса для гэтага, пачынаючы з цяперашняга сезону, не патрабуецца, расказала Святлана Цімошкіна:

— Цяпер мясцовыя ўлады самі вырашаюць, калі пачынаць сезон, самі падключаюць і паведамляюць пра гэта нам, а не ўзгадняюць тэрміны з Мінжылкамгасам.

Перш за ўсё падключаюцца дзіцячыя дашкольныя, школьныя і медыцынскія ўстановы, калі сярэдняя тэмпература на двары на працягу пяці дзён плюс 10 і ніжэйшая. Другое ў чарзе па цяпло жыллё, якое атрымлівае ацяпленне, калі тэмпература на вуліцы пяць дзён апускаецца ў сярэднім да васьмі градусаў і ніжэй. Апошнімі батарэі ўключаюць у адміністрацыйных і грамадскіх будынках, офісах.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Зручна. Танна. Экалагічна

Ад рэшткаў нізкаякаснай драўніны і адходаў лесапілавання да экспартаарыентаванай прадукцыі. Пяць тон каштоўнага біяпаліва ў гадзіну выпускае новы пялетны завод у Мазыры.

Новы аб'ект размясціўся недалёка ад Мазырскага дрэваапрацоўчага камбіната. Завод узведзены ў рэкордныя тэрміны: літаральна за паўгода, лічы што, у чыстым полі выросла высокатэхналагічная вытворчасць, якая ператварае адходы ў даходы. Вядома, пялеты — гэта не толькі найбольш перспектыўны для рэалізацыі від паліва, але яшчэ і бяспечны, высокапрадукцыйны, не патрабуе вялікіх складскіх памяшканняў. Пры вытворчасці пялетаў выкарыстоўваюцца толькі адходы дрэваапрацоўкі. Не менш важна, што выкіды ў атмасферу ад згарання гранул не такія шкодныя, як, напрыклад, ад вуглю ці дызпаліва. Такім чынам выкарыстанне пялетаў — гэта не толькі зручна і танна, але яшчэ і экалагічна.

Адкрыццё новай вытворчасці — сапраўды значная падзея не толькі для Гомельскай вобласці, але і для краіны ў цэлым. Магутнасць прадпрыемства складае 36 тысяч тон прадукцыі ў год. Гэта самы маштабны праект у лясной галіне, рэалізаваны ў апошні час.

Вытворчая магутнасць завода — каля 120 тон прадукцыі ў суткі. На поўную моц ён пачне працаваць ужо ў бліжэйшыя тыдні. Прадпрыемства забяспечыла 18 новых рабочых месцаў. Працэс вытворчасці цалкам аўтаматызаваны.

Варта адзначыць, што будаўніцтва пялетнага завода ў Мазыры — адзін з этапаў выканання даручэння Прэзідэнта па забеспячэнні поўнай перапрацоўкі драўняных рэсурсаў унутры краіны. Так, апошнім часам вялося будаўніцтва шасці пялетных вытворчасцяў. Першыя з іх былі ўведзеныя ў эксплуатацыю сёлета ў маі. Завод у Мазырскім доследным лясгасе — апошні аб'ект з першай шасцёркі і самая буйная пялетная вытворчасць з усіх пабудаваных раней.

На цырымоніі адкрыцця завода старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей адзначыў, што Мазыршчына традыцыйна ў ліку лідараў па стварэнні новых аб'ектаў. Так, за апошнія паўтара года на тэрыторыі раёна адкрыта 80 новых прадпрыемстваў, з якіх 22 — у сферы вытворчасці. У цэлым створана амаль тысяча новых рабочых месцаў.

— Прыемна адзначыць, што мы ў чарговы раз выканалі даручэнне Прэзідэнта і ўводзім пялетную вытворчасць на тэрыторыі Мазырскага раёна, — падкрэсліў кіраўнік абласной «вертыкалі» ўлады. — Характэрна, што першы ў сістэме Міністэрства лясной гаспадаркі пялетны завод адкрыўся менавіта ў нашай вобласці, у Жыткавіцкім раёне, 12 гадоў таму. Там жа ў мінулым месяцы мы адкрылі ўжо другую вытворчасць па выпуску паліўных пялетаў.

Старшыня аблвыканкама растлумачыў, што з прычыны выкарыстання ў асноўнай дрэваапрацоўчай вытворчасці круглага лесу, паўстала пытанне, якім чынам рэалізоўваць неліквідныя рэшткі драўніны. Бо, як нацэльвае кіраўнік краіны, перапрацоўка лясных рэсурсаў і сыравіны павінна быць безадходнай. Больш эфектыўная вытворчасць дасць магчымасць атрымліваць экспартную выручку, а, значыць, павышаць узровень эканамічнага развіцця не толькі ў рэгіёне, але і ў краіне ў цэлым.

Міністр лясной гаспадаркі Беларусі Віталь ДРОЖЖА, які прыехаў на адкрыццё новага пялетнага завода ў Мазыры, падкрэсліў, што перспектыўнасць стварэння такіх вытворчасцяў сёння бясспрэчная. Гэта і дадатковая выручка, і стварэнне новых рабочых месцаў, і павышэнне дабрабыту работнікаў. Між тым да канца наступнага года ў Беларусі плануюць запусціць не менш шасці аналагічных пялетных заводаў. Падлічана, што новыя аб'екты акупяць сябе на працягу 5-6 гадоў.

— У ліпені мы ўжо атрымалі першы мільён долараў выручкі ад гэтых вытворчасцяў, — адзначыў Віталь Дрожжа. — Мы не ставілі задачу ўніфікаваць вытворчасць, а таму далі свабоду кіраўнікам арганізацый у прыняцці рашэнняў. Абраная стратэгія грунтавалася на наяўнасці сыравіннай базы ў кожным рэгіёне, на аб'ёмах перапрацоўкі, на лагістыцы і фінансавым стане, — паведаміў міністр і дадаў, што завод у Мазыры самы магутны:

— Па Мазырскім лясгасе мы маем адны з самых вялікіх аб'ёмаў адгрузкі паліўнай дранкі. Характэрна, што па збыце прадукцыі такіх прадпрыемстваў сёння праблем няма. Паліва з задавальненнем купляюць у Еўропе. Вялікія надзеі беларусы ўскладаюць і на Кітай.

У Мінлясгасе звяртаюць увагу на эфектыўнасць пялетных вытворчасцяў і ў іншых сферах. Так, на новых заводах створана больш за 75 працоўных месцаў у раённых цэнтрах і сельскай мясцовасці. Спецыялісты будуць мець годны заробак, бо вытворчы працэс патрабуе высокай кваліфікацыі.

Па папярэдніх падліках, стварэнне шасці вытворчасцяў дазволіць краіне атрымаць каля 20 мільёнаў долараў дадатковай валютнай выручкі. Пры гэтым штогод у перапрацоўку будзе дадаткова ўцягнута да 350 тысяч кубічных метраў нізкаякаснай драўніны і больш за 120 тысяч кубічных метраў адходаў дадатковай лесапілавання.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

«ПРАСТУДА» НІЖЭЙ ПОЯСА

Ад чаго ўзнікаюць цыстыт і піеланефрыт

Пераахаладжэнне, стрэс ці гарманальны збой — і наш арганізм хутка рэагуе. Часта бегаць «па-маленькаму» — адна з праблем, якая істотна парушае нармальны рытм жыцця. І хоць справіцца з ёй можна самастойна, урачы не рэкамендуюць гэта рабіць. Чым небяспечныя інфекцыі мочапалавых шляхоў і чаму іх не варта пускаць на самацёк? Чаму гэта пераважна жаночая праблема? Як не дапусціць запалення ныркі і чым яно небяспечнае? Якія праблемы з'яўляюцца ў жанчын з узростам? Пра гэта і іншае нам расказала дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, дацэнт кафедры агульнай урачэбнай практыкі, кандыдат медыцынскіх навук, урач-акушэр-гінеколаг Аксана ЦЯСЛОВА.

— Аксана Аляксандраўна, растлумачце, што такое інфекцыі мочапалавых шляхоў.

— Перш чым назваць іх, давайце разбяромся, якія органы ўключаюць у паняцце «мочапалавая сістэма» і чаму іх аб'ядноўваюць. У класічнай анатоміі раздзяляюць мочавыдзяляльную і палавую сістэмы, бо ў іх розныя функцыі. Але падчас унутрывантробнага развіцця адбываецца іх адначасовае ўтварэнне — з адзінага зачатку. Акрамя таго, паколькі яны знаходзяцца побач у малым тазе, іх сценкі і навакольныя тканкі шчыльна мяжуюцца і «пераходзяць» з адной у другую. І пры развіцці інфекцыі часта ў запаленчы працэс уцягваюцца як органы палавой, так і мочавыдзяляльнай сістэм.

Запаленне кожнага органа мае сваю назву. Напрыклад, цыстыт — гэта запаленне мачавога пухіра, урэтрыт — запаленне мочаспускальнага каналу, вагініт — запаленчы працэс у похве, вульвіт — запаленне вонкавых палавых органаў у жанчын. Калі ў запаленчы працэс уцягнута некалькі анатамічных утварэнняў, гэта адлюстроўваецца і ў назве — вы можаце пачуць пра вульвавагініт, урэтрацыстыт ці назву, якая больш устаялася, — піеланефрыт — запаленне чашачна-лаханачнага і парэнхіматознага складнікаў ныркі.

— Якія з гэтых захворванняў найчасцей сустракаюцца?

— Тут многае вызначаецца ўзростам і тымі фізіялагічнымі і сацыяльнымі ўмовамі, якія гэты ўзрост суправаджаюць.

У дзяўчынак і дзяўчат больш распаўсюджаныя вульвіты, урэтрыты і цыстыты — запаленне звычайна не распаўсюджваецца на вышэйшыя аддзелы. Выклікаюць такія запаленчыя працэсы банальныя мікраарганізмы (іх яшчэ называюць умоўна патагеннымі), якія ў невялікай колькасці прысутнічаюць у складзе нармальнай мікрафлоры палавой, мочавыдзяляльнай і стрававальнай сістэм, у прыватнасці, кішэчныя палачкі, стафілакокі, клебсіелы, пратэй. Пад уздзеяннем правакуючых знешніх і ўнутраных фактараў, напрыклад, пераахаладжэння, парушэння правілаў асабістай гігіены або на фоне анамалій будовы органаў мочапалавой сістэмы ці іншых сур'ёзных сістэмных захворванняў, такіх як цукровы дыябет, гэтыя мікраарганізмы пачынаюць хутка размнажацца, «выцясняюць» карысную мікрафлору і становяцца прычынай хваробы. Зрэдку ў дзіцячым узросце ўзнікаюць інфекцыйныя паражэнні мочапалавых шляхоў, выкліканыя вірусамі або грыбкамі.

Самым «пікавым» момантам інфекцый мочапалавых органаў у жанчын з'яўляецца так званы перыяд палавога дэбюту. Гэта час пачатку сексуальнага жыцця. Пры неабароненых палавых кантактах адбываецца ўзаемаабмен мікрафлорай з партнёрам — і гэта могуць быць як «добрыя» мікраарганізмы, так і «дрэнныя» (патагенныя). Сярод іх і тыя, што выклікаюць інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам (хламідыі, мікаплазмы, урэаплазмы, трыхаманады), вірусныя (герпес, цытамегалавірус, папіломавірус) ці венерычныя захворванні (ганарэя, сіфіліс). На сённяшні дзень прэзерватыў з'яўляецца адзіным сродкам, які пры правільным выкарыстанні практычна цалкам выключае рызыку заразіцца палавымі інфекцыямі.

У так званым актыўным рэпрадуктыўным узросце — перыядзе найбольшай сексуальнай актыўнасці — нават пры манагамных адносінах або бяспечных сексуальных кантактах у жанчын могуць узнікнуць такія інфекцыйна-абумоўленыя захворванні, як кандыдоз або бактэрыяльны вагіноз (гарднерэлёз).

— З-за чаго яны ўзнікаюць?

— З-за цыклічных ваганняў узроўню палавых гармонаў, змянення напружанасці імунітэту, стрэсаў, залішняга выкарыстання інтымных гігіенічных і касметычных сродкаў або працэдур і іншага. Ёсць мноства прычын парушэнняў нармальнай мікрафлоры, якія адбываюцца з намі кожны дзень, на іх мы можам не звяртаць увагі і не звязваць са сваімі праблемамі. Відавочна, рызыка запалення мочапалавых органаў павышаецца пры траўматычных палавых кантактах, пераахаладжэнні, іншых запаленчых або сур'ёзных сістэмных захворваннях, якія патрабуюць прымянення антыбактэрыяльнай тэрапіі або прэпаратаў, што прыгнятаюць імунітэт.

— Якія праблемы чакаюць жанчын з узростам?

— У перад- і постменапаўзе (у народзе яго яшчэ называюць клімактэрычным узростам, або папросту — клімаксам, хоць насамрэч гэта не ўзрост, а хвароба) колькасць палавых гармонаў у арганізме катастрафічна памяншаецца — і гэта аказвае свой негатыўны ўплыў на мочапалавыя органы.

Слізістая, якая пакрывае мочавыводзячыя і палавыя органы знутры, вытанчаецца, павялічваецца рызыка мікратраўмаў. Без гармонаў зніжаецца тонус мышцаў, якія фарміруюць сценкі гэтых органаў, узнікае спачатку функцыянальная, а затым і анатамічная слабасць сфінктараў, што парушае нармальны адток мачы або прыводзіць да нетрымання. А парушэнні трофікі тканак ва ўмовах гарманальнага дэфіцыту прыводзяць да змены саставу нармальнай мікрафлоры похвы ў бок пераважнага ўмоўна-патагенных мікраарганізмаў.

Сукупнасць гэтых асноўных і многіх дадатковых неспрыяльных фактараў прыводзяць да ўзнікнення або абвастрэння запаленчых захворванняў мочапалавой сістэмы.

— Ці праўда, што жанчыны заражаюцца такімі інфекцыямі часцей, чым мужчыны? З чым гэта звязана?

— Сапраўды, пачынаючы з дзіцячага ўзросту, дзяўчаты, а потым і жанчыны часцей хварэюць на інфекцыі мочапалавых шляхоў у параўнанні з мужчынамі: па выніках навуковых даследаванняў — ад двух да 10 разоў! І гэта — кожная трэцяя жанчына.

Вядома, на першы план выступаюць анатамічныя адрозненні: у мужчын мачаспускальны канал вузкі і доўгі, у жанчын урэтра кароткая і шырокая. Што і стварае ўмовы для хуткага пранікнення мікраарганізмаў з ніжэйшых аддзелаў у вышэйшыя — гэта механізм узыходзячага інфіцыравання мачавога пухіра, а далей — мачаточнікаў і нырак. Ва ўмовах гарманальных ваганняў ці фізіялагічнага спаду ўзроўню палавых гармонаў у жанчын мускулатура мочавыводзячых шляхоў слабейшая, што стварае дадатковыя перадумовы для ўзнікнення інфекцый.

— З цыстытам сутыкалася хоць бы раз у жыцці, напэўна, любая жанчына. Якія яго асноўныя прыкметы?

— Цыстыт — гэта запаленне мачавога пухіра. Інфіцыраванне часцей за ўсё адбываецца узыходзячым шляхам — знізу праз запалёную ўрэтру, таму сімптаматыка зыходзіць з абодвух органаў. «Мясцовыя» сімптомы ўключаюць боль, рэзі або дыскамфорт падчас мочаспускання, пачашчаныя або «ілжывыя» пазывы і мочаспусканне малымі порцыямі. У жанчын часта пры гэтым прысутнічае сверб і пякота ў вобласці вонкавых палавых органаў, гнойныя выдзяленні з палавых шляхоў. Востры цыстыт, асабліва ў дзяцей, можа суправаджацца болямі ўнізе жывата ці ў надлабковой вобласці, дыспепсіяй (з ванітамі ці паносам), павышэннем тэмпературы цела.

Пры хранічным цыстыце, які часцей бывае ў дарослых, усе сімптомы значна слабейшыя, не парушаюць самаадчування і працаздольнасці чалавека, таму часта недаацэньваюцца па наступствах для здароўя.

— Ці можа гэта захворванне прайсці само?

— Многія вострыя захворванні могуць прайсці самастойна, але ці праходзяць яны бясследна пры адсутнасці належнага лячэння — вось у чым пытанне...

Так, на побытавым узроўні мы ўсе ведаем, што калі ты пачашчана «забегаў па-маленькаму» — трэба перад сном пасядзець у тазіку з цёплым растворам рамонку або марганцоўкі, а потым надзець шарсцяныя шкарпэткі і пакласці ў ногі грэлку — а раніцай цыстыту як не было. Для надзейнасці можна яшчэ прыняць пару «жоўтых таблетак ад нырак» — і тады ўжо дакладна. У шэрагу простых выпадкаў гэта можа дапамагчы справіцца з сімптомамі хваробы, але вылечыць прычыну і не перавесці захворванне ў разрад хранічных — малаверагодна. Таму лепш усё ж звярнуцца да доктара.

— Ці праўда, што без лячэння цыстыт можа перайсці ў піеланефрыт?

— Гэта так. Мікраарганізмы, ці то ўмоўна-патагенныя, ці то патагенныя, інфіцыруюць ныркі ўзыходзячым шляхам, паднімаючыся з мачавога пухіра па запалёных мачаточніках як супраць току мачы, так і з рэфлюксамі — зваротнымі закідамі мачы з мачавога пухіра пры, напрыклад, напружанні, падчас палавога акта, пры рэзкіх рухах.

— Ці могуць мочапалавыя інфекцыі выклікаць сур'ёзнае пашкоджанне нырак? Калі перахварэў на піеланефрыт, ці трэба потым дадаткова абследаваць ныркі?

— Так, піеланефрыт — гэта і ёсць інфекцыйна-абумоўленае (у абсалютнай большасці выпадкаў — бактэрыяльнае) паражэнне ныркі. Часцей за ўсё піеланефрыт бывае аднабаковым — спачатку ў ныначны лаханцы (з боку мачаточніка) развіваецца гнойнае запаленне, якое затым пранікае ў тканіну ныркі і ўцягвае ў працэс такім чынам увесь орган, прыводзячы да парушэння яго функцыі.

Праяўляецца востры піеланефрыт агульнымі сімптомамі ліхаманкі і інтаксікацыі і мясцова — болямі ў паясніцы, часцей з аднаго боку, парушэннямі мочавыпускання і змяненнем віду і характару мачы.

Калі своечасова ўстанавіць дыягназ вострага піеланефрыту і правесці правільнае лячэнне, то ў большасці выпадкаў можна пазбегнуць неспрыяльных наступстваў для ныркі. Аднак, калі старт лячэння быў несвоечасовы, тэрапія была не комплексная, і інфекцыі ўдалося парушыць не толькі функцыю нырак, але і выклікаць анатамічныя парушэнні, у такім выпадку захоўваецца рызыка хранізацыі піеланефрыту.

Дыспансерны нагляд за пацыентамі пасля перанесенага вострага піеланефрыту ажыццяўляецца на працягу не менш як года пры ўмове поўнай нармалізацыі аналізаў і адсутнасці сімптаматыкі.

Хранічны піеланефрыт — захворванне, пры якім нават пры нязначных зменах стану арганізма адбываецца абвастрэнне піеланефрыту, і чалавек вымушаны часта, а часам — і пажыццёва, праходзіць усе новыя і новыя курсы лячэння, пры гэтым стан нырак з кожным разам пагаршаецца. У шэрагу выпадкаў востры піеланефрыт можа быць звышагрэсіўны. Пры гэтым адбываецца такое масіўнае запаленне і пашкоджанне ныркі, што часам гэта прыводзіць да неабходнасці хірургічнага лячэння аж да выдалення ныркі.

— Як прадухіліць інфекцыі мочапалавых шляхоў?

— Наўрад ці мы можам прадухіліць усе фактары, асабліва тыя, што звязаныя з нашай фізіялогіяй. Знізіць рызыку захворванняў інфекцыямі мочапалавых шляхоў можна, калі прытрымлівацца прынцыпаў здаровага ладу жыцця і бяспечных палавых паводзінаў.

З пункту гледжання медыцынскай прафілактыкі ў нашай краіне наладжана дыспансерызацыя насельніцтва, і агульны аналіз мачы разам з агульным аналізам крыві з'яўляецца самым частым відам даследаванняў, прызначаных пацыенту пры звароце па медыцынскую дапамогу. Безумоўна важныя насцярожанасць і самаканторль пацыента, бо чым раней ад моманту з'яўлення сімптомаў будзе аказана кваліфікаваная медыцынская дапамога, тым вышэйшая верагоднасць не дапусціць ускладненых і запушчаных формаў. Мы заклікаем пацыентаў адмовіцца ад самалячэння нават у тых выпадках, калі захворванне працякае маласімптомна. Своечасовая дыягностыка і правільна падабранае доктарам лячэнне дапамогуць вам назаўсёды або надоўга развітацца з хваробамі.

Андрэй ЛІХАВІЦКІ:

АДКАЗНАСЦЬ, ЗАСЯРОДЖАНАСЦЬ І ЛЮБОЎ

Да старту Алімпійскіх гульняў у Токіа застаўся год. Увага да галоўных стартаў ужо пяцігодкі будзе каласальнай. «Звязда» знаёміць сваіх чытачоў са спартсменамі, за якімі наступным летам, затаіўшы дыханне, будуць сачыць уся Беларусь і ўвесь свет. На Алімпійскіх гульнях 1992 года ў Барселоне беларус Віталь Шчэрба стаў уладальнікам шасці залатых медалёў у спаборніцтвах па спартыўнай гімнастыцы. Лагічна, што беларуская спартыўная гімнастыка асацыруецца з яго іменем. Але час ідзе і краіне патрэбныя новыя героі, якія паступова з'яўляюцца на алімпійскім гарызонце.
Андрей Ліхавіцкі — прыклад таго, што геаграфічныя межы спорту не перашкода. Нарадзіўся ў Расіі, жыве ў Германіі, некалькі гадоў выступае за Беларусь. Алімпійскія гульні 2021 года стануць другімі ў яго кар'еры. Сам Андрэй не лічыць гэта нечым незвычайным. Чаму — ён расказаў «Звяздзе».

— Андрэй, самай гучнай падзеяй гэтага года стаў пераносАлімпійскіх гульняў у Токіа на наступны год. Як вы ўспрынялі гэту навіну?

— Для мяне гэта не стала вялікім ударам. Калі ўспомніць, як развіваліся падзеі некалькі месяцаў таму, стане зразумела, што ўсё да гэтага ішло. Да моманту афіцыйнай аб'явы аб пераносе Алімпійскіх гульняў ужо былі адмененыя ўсе спаборніцтвы, закрытыя граніцы. Аб якой падрыхтоўцы да алімпіяды, адборы для тых, у каго яшчэ не было ліцэнзіі, магла ісці гаворка? Мне здаецца, многія спартсмены нават выдыхнулі з палёгкай. Падтрымліваць форму, калі ўсё зачынена, і паўнавартасна рыхтавацца было вельмі складана. Асабіста мне перанос Алімпійскіх гульняў нават аказаўся на руку.

— Якім чынам?

— У мяне нарэшце з'явіўся час заняцца сваім здароўем і залячыць старыя траўмы. У кожнага спартсмена ёсць праблемы, якія жыць і трэніравацца не перашкаджаюць, але выправіць іх трэба. У мяне праблемы з плячамі, для спартсмена 34 гадоў гэта нармальна. Таму зараз я займаюся здароўем, а потым адразу ў бой.

— Напэўна, дадатковы год работы для спартсмена такога ўзросту дабаўляе цяжкасцей?

— Не сказаў бы. Годам больш, годам менш. Калі дазваляе здароўе і ёсць жаданне працаваць, чаму б і не правесці яшчэ адзін год у такім рэжыме. Я ў спартыўнай гімнастыцы ўсё свядомае жыццё. І з задавальненнем правяду з ёй яшчэ адзін год, а можа, нават і болей.

— Рыхтавацца да другіх Алімпійскіх гульняў у кар'еры спакайней, ці ўсё як у першы раз?

— Алімпійскія гульні — самыя галоўныя спаборніцтвы ў свеце і ў жыцці кожнага спартсмена. Але я стараюся на гэтым не зацыклівацца. Да любога старту неабходна падыходзіць адказна, кожны турнір — асаблівы. І ўсюды трэба паказваць дастойны вынік. У спорце ўсё ўзаемазвязана, нельга да аднаго старту падыходзіць без-адказна, а да іншага — сур'ёзна. Адказнасць павінна быць усюды. На мой погляд, думкі аб тым, што Алімпійскія гульні — самы галоўны турнір, могуць нават збіць. Халодная галава і засяроджанасць на выступленні — вось што вызначальна для любых стартаў.

— У 2016 годзе напярэдадні алімпіяды ў Рыа-дэ-Жанэйра ў інтэрв'ю вы адзначылі, што не лічыце Алімпійскія гульні кульмінацыяй кар'еры. За чатыры гады ваша меркаванне змянілася?

— Я спадзяюся, што кульмінацыяй маёй кар'еры будуць Алімпійскія гульні ў Токіа. Што такое кульмінацыя спартыўнай кар'еры? Гэта найлепшы вынік, дасканалае выступленне, задаволенасць сваёй работай. Вельмі хочацца ўсё гэта адчуць у Токіа ў наступным годзе. Канешне, у Рыа я быў маладзейшы, зараз мне можа быць цяжэй выступаць. З іншага боку, за гэтыя чатыры гады ў мяне з'явілася больш вопыту ў плане падрыхтоўкі да спаборніцтваў.

— Нягледзячы на тое што да Алімпійскіх гульняў яшчэ год, планы ўжо вызначылі?

— Мой план — дастойна выступіць і паказаць ўсё падрыхтаванае і напрацаванае за гэты час. Такі мой план мінімум. Калі быць больш канкрэтным, то планую выйсці ў фінал у практыкаваннях на кані. Задача спартсмена — паказаць, на што ён здольны, і зрабіць гэта добра. А адзнака — гэта ўжо справа судзейскай калегіі. Тым больш не трэба забываць, што ў ацэньванні спартыўнай гімнастыкі ўсё роўна ёсць месца для суб'ектыўнасці.

— Планавалася, што Алімпійскія гульні могуць прайсці без гледачоў. Наколькі вам важная падтрымка трыбун?

— Мне важна, каб на трыбунах былі людзі. Не ўяўляю, як выступаць у пустой зале. Падтрымка гледачоў нібы адкрывае другое дыханне, яна дае дадатковую сілу. У 2019 годзе на Еўрапейскіх гульнях у Мінску гледачы вельмі дапамагалі настроіцца на выступленне і паказаць добры вынік. Мой бронзавы медаль — часткова і іх заслуга.

— Андрэй, сярод беларускіх гімнастаў вы адзін маеце алімпійскую ліцэнзію. Ганарова быць адзіным прадстаўніком краіны на Алімпійскіх гульнях?

— Я не зусім адзін буду прадстаўляць Беларусь. Сярод дзяўчат алімпійская ліцэнзія ёсць у Насці Алістратавай. Але насамрэч сітуацыя дваякая. Канешне, прыемна аднаму прадстаўляць краіну, хоць гэта надта адказна. Але ўсё ж такі хацелася б, каб побач была каманда. З камандай на спаборніцтвах заўжды прасцей, гэта дадатковая і вельмі моцная падтрымка. Так, у нас індывідуальны від спорту і выступаем мы па адным. Але ўсё роўна камфортней, калі побач ёсць твае сябры, якія за цябе перажываюць. І не варта забываць, што ў спартыўнай гімнастыцы ёсць камандныя спаборніцтвы, вельмі відовішчныя і захапляльныя.

— Як вы лічыце, чаму ў Беларусі вам няма роўных?

— Мне цяжка сказаць, якія дакладна праблемы ў беларускай спартыўнай гімнастыцы. Усё ж такі я не знаходжуся ўнутры. Мне здаецца, прычына ў адносна невялікім наборы дзяцей. А для тых, хто ёсць, не хапае залаў. І някепска, калі ў адной групе ў трэнера 20 дзяцей, і ён фізічна не можа належным чынам аддаваць увагу самаму таленавітаму вучню. Я думаю, калі б у Беларусі было крыху больш залаў, дзяцей, з'явілася бы больш моцных спартсменаў. Не ведаю, правы я ці не, але будучае прафесійнага спорту закладваецца ўжо на дзіцячым узроўні. Дарэчы, не згаджуся, што мне няма роўных. У нас у камандзе ёсць класныя хлопцы Ягор Шарамкоў і Слава Драніцкі, чэмпіён Еўропы сярод юніёраў. Яны добра скачуць і нядрэнна выступаюць у шматбор'і. Я ўпэўнены, што ў іх усё напарадзе.

— Андрэй, па вопыце жыцця і працы ў Германіі, можаце сказаць, дзе больш дасканалы падыход да спартыўнай гімнастыкі — у Беларусі ці ў Германіі?

— Асабіста мне больш імпануе беларуская сістэма. У нашай краіне шмат секцый, ёсць школы алімпійскага рэзерву, дзе дзеці ўжо з малых гадоў могуць сур'ёзна займацца спортам і сумяшчаць гэта з вучобай. У Германіі ўсе маладыя гімнасты займаюцца ў адной зале, у іх адна трэніроўка на дзень замест дзвюх. На ўсю краіну працуе толькі адзін ці два цэнтры, дзе дзеці ўжо з дзесяці гадоў сур'ёзна займаюцца. Зразумела, што для падрыхтоўкі моцнага спартыўнага рэзерву гэтага недастаткова. Аднак перавага нямецкай сістэмы ў тым, што трэнеры не такія загружаныя і маюць магчымасць набіраць у групу самых таленавітых дзяцей і расціць з іх прафесійных спартсменаў. А ў нас як? Трэнер набірае 20 чалавек і працуе з усімі адразу, яны паступова адсейваюцца, і калі застаюцца самыя адораныя, пачынаецца руплівая праца. Але, нават нягледзячы на гэта, беларускі падыход мне падабаецца больш.

— У Германіі функцыянуе клубная сістэма, правільна?

— Так, але гэта толькі прыгожая назва. Энтузіясты адкрываюць клубы, каб дзеці маглі займацца спортам. Гэта непрафесійныя клубы, яны не зарабляюць грошы. У Германіі я добрых прыкладаў не бачыў. Нядрэнна гэта развіта ў ЗША, дзе людзі гатовыя ўкладвацца ў клубы. Напрыклад, школа Віталя Шчэрбы ў Лас-Вегасе. Прызнаюся, у мяне ёсць думкі ў будучым адкрыць свой клуб у Мінску, думкі аб пераездзе таксама ёсць. Але пакуль галоўнае — мая спартыўная кар'ера.

— Дарэчы, аб Віталю Шчэрбе. Яго імя нязменна асацыруецца з беларускай спартыўнай гімнастыкай. Як вы ставіцеся да таго, што вас могуць параўноўваць?

— Зусім пра гэта не думаю. Віталь — легенда сусветнай спартыўнай гімнастыкі, і яму да гэтага часу няма роўных. Я думаю, ні аднаму спартсмену не ўдасца яго перасягнуць, ва ўсякім выпадку сярод дзеючых гімнастаў. Таму параўноўваць нас няправільна. Мне пашанцавала асабіста пазнаёміцца з Віталем, гэта была надта натхняльная для мяне сустрэча.

— Спартыўная гімнастыка часоў Віталя Шчэрбы і тая, якую вы дэманструеце сёння, моцна адрозніваюцца?

— Гімнастыка ўвогуле інтэнсіўна змяняецца. У 2004 годзе былі прынятыя новыя правілы. Зараз акцэнт робіцца на складанасці элементаў, таму гімнасты зараз больш масіўныя і мускулістыя. Для таго каб набраць высокі бал, патрэбна паказаць дзесяць самых складаных элементаў. А раней было дастаткова чатырох, пасля якіх ішлі дадатковыя элементы і звязкі. Мне здаецца, раней у спартыўнай гімнастыцы было больш прыгажосці і выступленні былі больш вытанчаныя.

— У сусветным спорце сёння назіраецца тэндэнцыя да амаладжэння, спартыўную гімнастыку гэта закранула?

— Гімнастыка заўжды была маладым відам спорту. Мы пачынаем трэніравацца ў шэсць гадоў, а ў 18 некаторыя спартсмены ўжо выступаюць на Алімпійскіх гульнях. Шмат маладых спартсменаў б'юць рэкорды і заваёўваюць медалі вялікіх спаборніцтваў. Але гэта залежыць ад індывідуальных асаблівасцяў арганізма. Я не магу сказаць, што ў спартыўнай гімнастыцы пераважае моладзь. Ды што там казаць, калі я ў свае 34 гады выступаю і рыхтуюся да алімпіяды. Румынскі гімнаст Мар'ян Драгулеску ў свае 39 гадоў паказвае выдатныя вынікі. І мы не адны такія «дыназаўры», на спаборніцтвах можна сустрэць шмат гімнастаў, старэйшых за 30 гадоў.

— Ці рэальна дасягнуць аднолькавага поспеху ў выступленнях на ўсіх сямі снарадах, або ўсё роўна прыходзіцца нечаму аддаваць перавагу?

— Прыходзіцца вылучаць некаторыя снарады. У мяне каронныя конь, брусы і перакладзіна. Калі ўспомніць, то бронза II Еўрапейскіх гульняў у мяне была ў практыкаваннях на кані. Але зразумела, што трэба старацца на кожным снарадзе паказваць дастойны вынік. У нас ёсць шматбор'е, дзе гімнасты добра выступаюць на кожным снарадзе. А зараз узровень гэтай дысцыпліны значна вырас. Раней можна было няўдачу на адным снарадзе закрыць іншым. Сёння гэта ўжо немагчыма.

— Андрэй, што вас рухае ўсё жыццё аддаваць спартыўнай гімнастыцы?

— Не хачу паказацца банальным, але любоў. Я ў спартыўнай гімнастыцы ўсё жыццё, з самага дзяцінства. І ўжо не ўяўляю сябе без яе.

Фота з асабістага архіва героя.

ПАДНЯЦЬ ВЕТРАЗІ! ПОЎНЫ НАПЕРАД!

Беларускі парусны спорт узяў курс на поспех

Беларуская федэрацыя паруснага спорту.

Шум хваляў, свіст ветру і лятучы ветразь над вадой — карціна звыклая для марскіх пейзажаў Іспаніі ці Італіі. Аказваецца, для Беларусі таксама. Пунсовыя ветразі кніжнай Асолі — сімвал надзеі і мары. Белыя ветразі беларускіх яхтсменаў — сімвал іх веры ў сябе і спартыўнай сілы, пад якімі яны ўпэўнена ідуць да сваіх мэт.

Мора няма, а спорт ёсць

Парусны спорт у Беларусі з'явіўся ў другой палове 1960-х. А ў 1977 годзе ў актыве беларускіх яхтсменаў ужо быў залаты медаль юніёрскага чэмпіянату Еўропы, які заваяваў Сяргей Харэцкі ў класе «Фін». У гэтым жа годзе зборная каманда Беларусі заняла першае агульнакаманднае месца на II Усесаюзных спартыўных гульнях моладзі. Пачынаючы з 1980 года беларускія яхтсмены — пастаянныя ўдзельнікі Алімпійскіх гульняў. Для краіны, дзе няма мора, сам факт развіцця паруснага спорту і дастойных выступленняў спартсменаў на міжнародным узроўні здаецца нонсэнсам. І ў гэтым заключаецца непрадказальнасць згаданага віду спорту. Зрэшты, не толькі ў гэтым...

Аказваецца, для яго развіцця наяўнасць мора зусім неабавязковая. У гэтым упэўнены **старшыня Беларускай федэрацыі паруснага спорту Алег СПОЛАН:** «Тое, што займацца парусным спортам можна толькі на моры — стэрэатып. Усе расійскія паспяховыя яхтсмены, пераможцы і прызёры вялікіх міжнародных спаборніцтваў выраслі ў Даўгапрудным на Клязменскім вадасховішчы. У савецкі час трохразовы алімпійскі чэмпіён Валянцін Манкін вырас на Кіеўскім вадасховішчы. А ў Крыме ў той час не было ніводнага яхтклуба. Лідары сусветнага паруснага спорту, італьянцы, працуюць на возеры Гарда.

Сваё мора ў беларусаў усё ж такі ёсць. На беразе Мінскага мора ўжо 22 гады працуе Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па парусным спорце. Летам спартсмены пакараюць хвалі Мінскага мора, а зімой закладаюць фундамент формы на лета. Спартсменам неабходна агульная і сілавая выносліваць, спрытнасць, каардынацыя рухаў. «Часцей за ўсё спаборніцтвы праходзяць у вельмі сцісліым тэрміны. За чатыры дні трэба праехаць 12 гонак, то-бок па тры гонкі ў дзень. Кожная гонка займае прыкладна гадзіну. І ўвесь гэты час спартсмен выстрымлівае вялізную нагрузку на ногі, прэс, спіну, трэба пастаянна трымаць вяроўкі. Пры моцным ветры нагрузка павялічваецца ўдвая, таму і чэмпіёнамі становяцца тыя, хто добра падрыхтаваны фізічна. У нас ёсць алімпійская дысцыпліна — віндсёрфінг, вельмі экстрэмальная. У ёй выступаюць спартсмены, якія падцягваюцца больш як 20 разоў, плаваюць па першым спартыўным разрадзе. Яны ўвесь час трымаюць баланс дошкі, утрымліваюць парус, і ўсё гэта падчас руху з хуткасцю катара», — расказвае Алег Сполан.

На алімпійскай хвалі

Сенсацыйны перанос Алімпійскіх гульняў на 2021 год аказаўся на руку беларускім яхтсменам. «Мы не чэмпіёны свету, у нас вельмі маладая каманда, якая толькі на пад'ёме. І гэты год — выдатная магчымасць для нашай моладзі павысіць сваё майстэрства. Канешне, лідарам будзе цяжка яшчэ год утрымацца на вяршыні і ў Токіа пацвердзіць сваё майстэрства. За год можа з'явіцца хтосьці больш моцны, напрыклад, беларусы», — дзеліцца Алег Сполан.

У праграму Алімпійскіх гульняў уключаны дзесяць дысцыплін паруснага спорту. У Беларусі развіваецца толькі чатыры з іх: «Лазер-стандарт», «Лазер-радыял», віндсёрфінг RS:X у мужчын і жанчын. Яхты класа «лазер» — самыя вядомыя і папулярныя ў свеце. Пачынаючы з Алімпійскіх гульняў 2008 года, мужчыны і жанчыны спаборнічаюць у асобных класах «Лазер-стандарт» і «Лазер-радыял» адпаведна. Паміж сабой гэтыя яхты адрозніваюцца памерамі і формамі паруса і мачты. Віндсёрфінг — гэта спаборніцтвы на лёгкай дошцы з усталяваным на ёй парусам. Дарэчы, алімпійскі клас дысцыпліны RS:X прадугледжвае гонкі на адноклавых камплектах аднаго вытворцы. Абсталяванне для віндсёрфінга складаецца з дошкі шырынёй 93 сантыметры і даўжынёй 286 сантыметраў і паруса.

Беларускія спартсмены заваявалі алімпійскія ліцэнзіі ў двух відах — «Лазер-радыял» і віндсёрфінг RS:X у мужчын. У парусным спорце пуцёўкі на алімпіяду неімянныя і размяркоўваюцца паміж краінамі. Пры гэтым кожная краіна ў кожным відзе праграмы можа прадставіць толькі аднаго спартсмена. Таму пакуль невядома, хто канкрэтна з беларускіх спартсменаў наступным летам адправіцца ў Токіа. Кіраўніцтва федэрацыі адзначае, што ў кожным відзе праграмы ёсць па два раўнацэнныя лідары-кандыдаты. Ім яшчэ давядзецца паспаборнічаць за алімпійскія пуцёўкі на вясеннім чэмпіянаце Еўропы і Кубку Беларусі.

У віндсёрфінгу RS:X лідары Арцём Джавадаў і Мікіта Цыркун. У розныя гады хлопцы станавіліся прызёрамі і пераможцамі чэмпіянатаў свету і Еўропы сярод юніёраў. Яны ж і заваявалі алімпійскія ліцэнзіі. Сярод дзяўчат у гэтай дысцыпліне найлепшыя вынікі паказваюць юніёркі Юлія Матвіенка і Яна Ломаць. На мінулагоднім чэмпіянаце свету сярод юніёраў Юлія заняла чацвёртае месца. Старшыня федэрацыі ўпэўнены, што сёлета яна магла б заваяваць медаль, калі б турнір не быў адменены. Юлія і Яна яшчэ будуць удзельнічаць у розыгрышы ліцэнзій на Алімпійскія гульні.

Спорт без узросту

У класе «Лазар-радыял» ужо 20 гадоў няма роўных Таццяне Драздоўскай. Удзелам у пяці Алімпійскіх гульнях можа пахваліцца не кожны спартсмен, не толькі ў парусным спорце, але і ў любым іншым. Чэмпіёнка свету і чэмпіёнка Еўропы зноў заваявала алімпійскую ліцэнзію. Але няма гарантыі, што краіну ў Токіа будзе прадстаўляць менавіта Таццяна. Легендарнай спартсменцы дыхае ў спіну Кацярына Санько, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы сярод моладзі 2019 года. Сама ж Таццяна ставіцца да гэтага са спартыўнай філасофіяй: «Канешне, мне хочацца выступіць на сваёй шостай алімпіядзе, і я прыкладаю да гэтага ўсе намаганні. Кожныя Алімпійскія гульні — асаблівыя, яны даюць абсалютна новыя эмоцыі, матывацыю. Пастаянна мяняюцца людзі, а ад гэтага мяняюцца тактыка і стратэгія. А гэта ўжо новыя веды і непаўторны вопыт. Другое месца Кацярыны Санько на чэмпіянаце Еўропы стала сапраўдным прарывам у беларускім парусным спорце. У нас даўно не было такіх вынікаў. І хоць нам яшчэ прыйдзецца спрачацца за пуцёўку ў Токіа, я рада, што ў нас ёсць моцная моладзь. Трэба і маладым спартсменам даваць шанц заявіць аб сабе».

У парусным спорце немагчыма ўгадаць, у якім узросце спартсмен можа паказваць свой найлепшы вынік. І ў гэтым яшчэ адна прычына яго непрадказальнасці. Спаборніцтвы з сапернікамі ўдвая маладзейшымі — звычайная справа для спартсменаў. Немец Ёхен Шуман у 1976 годзе выйграў Алімпійскія гульні ў Манрэалі ў 22 гады. Пасля ён яшчэ тры разы станавіўся алімпійскім чэмпіёнам. А савецкі яхтсмен Барыс Буднікаў выйграў чэмпіянат Еўропы і заваяваў «сераброо» Алімпійскіх гульняў 1980 года ва ўзросце 40 гадоў. Таццяна Драздоўская перамагла на чэмпіянаце свету — 2007 у 29 гадоў. Па словах старшыні федэрацыі, сёння ў свае 42 яна паказвае найлепшыя вынікі па агульнай фізічнай падрыхтоўцы.

Пад ветразямі надзеі

Беларускі парусны спорт сканцэнтраваны ў Мінску. У сталіцы працуе дзіцяча-юнацкая спартыўная школа паруснага спорту. У Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі ёсць групы як пачатковай падрыхтоўкі, так і вышэйшага спартыўнага майстэрства. Увогуле парусным спортам займаецца больш за 400 юных спартсменаў. «Мы можам набраць і болей дзяцей, на шчасце, інтарэс да нашага спорту ёсць. Але мы абмежаваныя магчымасцямі бюджэту. Школы ўтрымліваюцца на бюджэтныя сродкі, і ёсць дакладны план камплектавання, трэнерскіх ставак і колькасці вучняў. Парусны спорт развіваецца ў Гомелі і Гродне, дзе таксама працуюць дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы. Зараз мы адкрываем аддзяленне нашай федэрацыі на Браслаўскіх азёрах», — расказаў Алег Сполан.

Развіццё паруснага спорту цесна звязана з яшчэ адной важнай праблемай, якая датычыцца не толькі яхтсменаў, упэўнены кіраўнік федэрацыі: «У нас не распаўсюджаны рачны турызм, які непасрэдна звязаны з развіццём нашага віду спорту. У Беларусі шмат рэк і азёр, гэта можа прывабліваць турыстаў, яхтсменаў-аматараў. А на справе практычна ні на адной рацэ няма дзе паставіць яхту, няма ні бухты, ні прычала. На беразе вадаёмаў нельга будаваць гасцініцы, яхт-клубы. На азёрах Гарда, Балатон можна, а ў нас нельга. Але я спадзяюся, гэта калісьці будзе выпраўлена, у нас з'явіцца рачны турызм, і парусны спорт у Беларусі набудзе другое дыханне».

Парусны спорт з яго імклівасцю і відовішчнасцю заслугоўвае большай вядомасці і папулярнасці. У свеце яго развіваюць толькі 105 краін, і Беларусь сярод іх не на апошнім месцы. Так, узровень беларусаў не такі высокі, як у сусветных лідараў з Нідэрландаў, Іспаніі, Італіі. Але беларускія спартсмены імкнуцца гучна заявіць аб сабе на міжнародным узроўні. І чым больш людзей ведае пра гэты від спорту, тым лепш, упэўнена Таццяна Драздоўская: «Парусны спорт апошнім часам значна прагрэсіруе, з'яўляецца ўсё больш амаатараў. Але гэтага недастаткова. Хочацца, каб як мага больш людзей ім займалася. Парусны спорт варты таго, каб удзяляць яму ўвагу».

МАЙСТАР-КЛАС НА БУДУЧЫНЮ

XXVII летнім Алімпійскім гульням — 20 гадоў!

Дваццаць гадоў таму на стадыёне «Аўстралія» лёгкаатлетка Кэтрын Фрыман запаліла агонь першых Алімпійскіх гульняў новага тысячагоддзя. Алімпіяда 2000 года ў Сіднеі ўвасабляла ўсе алімпійскія ідэалы: спартыўныя дасягненні, адзінства, стойкасць і інавацыі.

Важнай рысай алімпіяды ў Сіднеі стаў клопат аб навакольным асяроддзі. Усе аб'екты былі пабудаваны з экалагічна чыстых матэрыялаў. Было ачышчана 160 гектараў водных рэсурсаў і засвоена 180 гектараў прамысловых пустак. Гульні паспрыялі ўладкаванню многіх прылеглых да горада раёнаў. Пасля Сіднея алімпійскія аб'екты будуюцца з экалагічна чыстых матэрыялаў, з нагоды Алімпійскіх гульняў ствараліся ініцыятывы і праграмы па абароне навакольнага асяроддзя. Гэтыя і іншыя праграмы напраўлены на павышэнне дасведчанасці ўдзельнікаў і гледачоў алімпіяды аб уплыве вялікіх спартыўных падзей на экалагічную сітуацыю ў свеце. Пачынаючы з Лондана-2012 арганізатары Алімпійскіх гульняў актыўна супрацоўніча з незалежнымі прыродаахоўнымі арганізацыямі — Сусветным фондам дзікай прыроды (WWF) і «Грынпіс».

З кожным алімпійскім цыклам экалагічная павестка становіцца больш актуальнай. Алімпійскія гульні ў Токіа мусяць стаць самай экалагічнай алімпіядай — калі не ва ўсёй алімпійскай гісторыі, то на бліжэйшыя два гады дакладна, да алімпіяды 2022 у Пекіне. У японскай сталіцы будзе выкарыстоўвацца электрычнасць выключна з узнаўляльных крыніц. Пастаменты і подыумы выканання з пластыкавых адходаў. Алімпійскі факел — з перапрацаванага алюмінію. Нават 18 тысяч ложкаў для спартсменаў зроблены з перапрацаванага кардону. Кожны ахвотны змог унесці свой уклад у стварэнне алімпійскіх медалёў. Арганізатары сабралі 6,2 мільёна старых гаджэтаў, каб атрымаць патрэбныя металы. Усяго старая тэхніка дала 32 кілаграмы золата, з якога зроблены медалі Токіа-2021.

Аднак на першым месцы ў Сіднеі ўсё ж такі быў спорт, які таксама прынёс шэраг значных падзей. Упершыню ў праграму Алімпійскіх гульняў былі ўключаны трыятлон, тхэквандо і скачкі на батуце. У спартыўнай гісторыі Камеруна з'явіўся першы залаты медаль алімпіяды, які заваявала каманда па футболе. На спаборніцтвах па стэндавай стральбе ўкраінец Мікалай Мільчаў выбіў 150 мішэняў са 150. Гэта вечны сусветны рэкорд, які можна паўтарыць, але не перавзысці. Дасюль не пабіты рэкорд іранскага цяжкаатлета Хусейна Рэзазадэ, які ў суме сваіх спроб падняў 472,5 кілаграма.

Свой уклад у алімпійскую гісторыю ўнеслі і беларускія ўдзельнікі Алімпійскіх гульняў у Сіднеі. Беларусь прадстаўлялі 140 спартсменаў у 21 відзе спорту. Усяго беларусы заваявалі 17 медалёў, з іх тры — вышэйшай пробы. Свой першы і адзіны алімпійскі медаль у Сіднеі ўзяла Яніна Правалінская-Карольчык — у спаборніцтвах па штурхані ядра яна закінула снарад на 20 метраў 56 сантыметраў у шостай спробе. Сваё слова на гэтай алімпіядзе сказала і Эліна Зверава. Бронзавая прызёрка Алімпійскіх гульняў 1996 года ў кіданні дыска ў Сіднеі ўзяла золата. Яе вынік — 68 метраў 40 сантыметраў — аказаўся недасягальным для саперніц. Тады ж двухразовай алімпійскай чэмпіёнкай у акадэмічнай грэблі стала легендарная Кацярына Карстэн. У 2000 годзе зорка яе таленту і майстэрства толькі разгаралася, каб свяціць яшчэ 19 гадоў да завяршэння кар'еры ў 2019 годзе.

Два сярэбраныя медалі Сіднея прынесла мастацкая гімнастыка. Юлія Раскіна заняла другое месца ў адзіночным першынстве, а зборная Беларусі — у камандным. Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь і шасцікратны чэмпіён свету ў стральбе з пісталета Ігар Басінскі на алімпіядзе 2000 года таксама падымаўся на другую і трэцюю ступені п'едэстала.

Бронзавых медалёў беларускія спартсмены прывезлі з Аўстраліі ажно адзінаццаць. Тры з іх заваявалі лёгкаатлеты. Ірына Ятчанка і Ігар Астаповіч у кіданні дыска і Наталля Сазановіч — у сямібор'і. Першы алімпійскі медаль у дзюдо для Беларусі заваяваў Анатоль Ларукоў. Адзначыліся і стралкі. Лаліта Яўглеўская стала бронзавай прызёркай у стральбе з пісталета. А Сяргей Мартынаў атрымаў медаль у спаборніцтвах з вінтоўкай. Праз 12 гадоў у Лондане Сяргей узяў рэванш і стаў першым у гісторыі незалежнай Беларусі алімпійскім чэмпіёнам па стральбе. Папоўнілася медальная скарбонка і ў цяжкай атлетыцы. Генадзь Аляшчук у катэгорыі 62 кг і Сяргей Лаўрэнаў у катэгорыі 69 кг занялі трэція месцы. Павел Доўгаль і Дзмітрый Дзябелка заваявалі бронзавыя медалі ў сучасным пяцібор'і і грэка-рымскай барацьбе адпаведна.

Алімпійскія гульні 2000 года паказалі прыклад, як галоўныя старты чатырохгоддзя павінны аб'ядноўваць людзей усіх прафесій і нацыянальнасцяў. Гэта быў удалы майстар-клас па выкананні алімпійскіх прынцыпаў.

Матэрыялы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 27 октября 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Условия продажи: **1.** После проведения аукциона Продавец уполномочивает Покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков, необходимых для обслуживания предмета аукциона. **2.** Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с Продавцом. **3.** Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Продавца (предварительная схема пользования земельного участка под объект продажи прилагается)			
1	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34614**, площадью **3 122,6 кв. м**, назначение – складское помещение, наименование – **изолированное помещение № 10. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-10	**436 800,00**	21 840,00

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07, главный инженер – Галактионов Виктор Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА»):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000, БИК BELBBY2X, ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 23 сентября 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 23 октября 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно срокам договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

Организатор торгов (ликвидатор Закрытого акционерного общества «Торговый дом Елизово») объявляет о проведении ПОВТОРНЫХ торгов по продаже имущества в форме аукциона

Продавец	Закрытое акционерное общество «Торговый дом Елизово»
Место проведения торгов	г. Минск, проспект Партизанский, дом 8, корпус 14, 1-й этаж, помещение 8
Дата и время проведения торгов	07.10.2020 г. в 12.00
Срок подачи заявок	Не позднее 02.10.2020 г. до 17.00
Ранее опубликованные извещения	Газета «Звязда» от 11.03.2017, 23.05.2017, 05.09.2017, 02.09.2020
Предмет торгов и начальная цена	Опубликованы в газете «Звязда» от 02.09.2020, с понижением начальной цены каждого лота на 25 %
Порядок подачи заявок	Заявления на участие в торгах с приложением платежных документов, подтверждающих внесение задатка, принимаются по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 13.00 либо направляются по адресу: 220033, г. Минск, а\я 13, со дня выхода настоящего извещения
Задаток	Задаток в размере пяти процентов от начальной цены лота перечисляется на р/с BY05MTBK30120001093300064583 в ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, получатель – ЗАО «Торговый дом Елизово», УНП 101483556
Условия аукциона	Шаг аукциона: пять процентов. При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, и он согласен приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов, а также победитель аукциона – претендент на покупку должен заключить с продавцом договор купли-продажи в течение двух рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц. Оплата стоимости предмета торгов осуществляется в течение пяти банковских дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не определено договором купли-продажи. Возмещение затрат, связанных с организацией и проведением торгов, осуществляется участником, выигравшим торги, в течение пяти банковских дней со дня проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты их проведения. Порядок проведения аукциона установлен Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

С дополнительной информацией можно ознакомиться по месту проведения торгов или по тел. +375 29 687 08 53.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Лоевский КБО»** (УНН 400028996) 247095, Гомельская обл., г. п. Лоев, ул. Ленина, 24а, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **26 октября 2020 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС
1	Капитальное строение, инв. № 340/С-314808, площадь – 87,6 кв. м, назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, Гомельская обл., Лоевский р-н, Карповский с/с, д. Карповка, ул. Юрия Гагарина, 17	8083,33
2	Капитальное строение, инв. № 340/С-314434, площадь – 471,6 кв. м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель (здание столярного цеха), Гомельская обл., Лоевский р-н, г.п. Лоев, ул. Батова, 59А	40083,33
3	Капитальное строение, инв. № 340/С-314435, площадь – 41,5 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59А/1	3333,33

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 24.09.2020 г. 09.00 по 23.10.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Речицкий завод «Термопласт» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Олейника П. С. извещает о проведении 6 октября 2020 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 40 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: **1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Лоты № № 1, 2, 3, 8 расположены на земельном участке с кадастровым номером **324550100001000008** площадью **2,3400 га** и предоставлены **ОАО «Речицкий завод «Термопласт»** на праве постоянного пользования. Целевое назначение земельного участка: размещение промышленных объектов. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя. В связи с обеспечением возможности для каждого из образованных в результате раздела (выделения, деления) земельных участков беспрепятственных подъездов (подходов) для организации доступа к ним с целью содержания и обслуживания покупателями приобретенных зданий и сооружений в соответствии со ст. 268 ГК Республики Беларусь, ст.ст.19,45 «Кодекса Республики Беларусь о земле» установить право ограниченного пользования чужим недвижимым имуществом (сервитут) на объекты недвижимости (земельные участки) через которые покупатели каждого из выставляемых на аукцион лотов после их приобретения имели бы доступ к ним с целью содержания и обслуживания приобретенных зданий и сооружений. **3.** В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Чапаева, 57				
1	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285190**, общей площадью **614,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание материального склада. Капитальное строение с инв. № 340/С-1847**, общей площадью **580,7 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание. Ограничение (обременение):** договор аренды № 4 от 09.10.2019 г., сроком действия по 08.10.2020 г., площадь, сданная в аренду, – **44,9 кв. м.** Канализационная сеть – 160,0 м (инв. № 11). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 350,0 кв. м (инв. № 16). Забор железный с металлическими воротами – выделенная 1\6 часть ворот (инв. № 10). Система видеонаблюдения (инв. № 393)	**84 305,10**	4 215,26	8 430,51
2	**Капитальное строение с инв. № 340/С-299838**, общей площадью **936,7 кв. м,** назначение – здание для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание цеха для размещения линий по переработке полимерсодержащих отходов и выпуску предизолированных труб.** Забор железобетонный – 138,15 м. п. (инв. № 14). Канализационная сеть – 220,0 м (инв. № 11). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 1 117,85 кв. м (инв. № 16). Экструзионная линия для производства PE-труб 75 с зоной дегазации и сменной сетки на трубы D 75,90,110,160,200,250 мм, ЛТМО – 90х30-75\160 (инв. № 385). Экструзионная линия производства напорных труб для газопроводов, многослойных труб, для отопления из полиэтилена D 50,63,75,90,110 мм (инв. № 397). Линия экструзионная для производства PE-RT трубы (5-слойной) с защитным кислородным слоем (инв. № 398). Принтер капелеструйный Willet-430 (инв. № 400-А). Забор железный с металлическими воротами – выделенная 1\6 часть ворот (инв. № 10)	**630 435,43**	31 521,77	63 043,54
3	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285193**, общей площадью **357,6 кв. м,** назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание производства полиэтиленовой пленки и полиэтиленовых труб № 1. Ограничение (обременение):** договор аренды № 1 от 29.01.2018 г., сроком действия по 15.09.2022 г., площадь, сданная в аренду, – **357,6 кв. м. Капитальное строение с инв. № 340/С-285196**, общей площадью **642,2 кв. м,** назначение – здание для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание производства ТНП № 2. Ограничение (обременение):** договор аренды № 1 от 29.01.2018 г., сроком действия по 15.09.2022 г., площадь, сданная в аренду, – **642,2 кв. м. Капитальное строение с инв. № 340/С-285192**, общей площадью **275,0 кв. м,** назначение – здание многофункциональное, наименование – **здание бытовых помещений.** Линия для производства труб ЛТ-63х25 (инв. № 193). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 350,0 кв. м (инв. № 16). Канализационная сеть – 160,0 м (инв. № 11). Забор железный с металлическими воротами – выделенная 1\6 часть ворот (инв. № 10)	**121 743,00**	6 087,15	12 174,30
8	**Капитальное строение с инв. № 340/С-285198**, общей площадью **457,0 кв. м,** назначение – здание специализированное для переработки нефти и газа, производства химических веществ, резиновых и пластмассовых изделий, прочих неметаллических минеральных продуктов, наименование – **здание производства труб полиэтиленовых № 2.** Линия для производства труб 45-73 мм. ЛТМ-63х30 (инв. № 257). Забор железобетонный – 56,0 м. п. (инв. № 14). Асфальтобетонное покрытие двора и дороги – 140 кв. м (инв. № 16). Забор железный с металлическими воротами – выделенная 1\6 часть ворот (инв. № 10)	**65 429,38**	3 271,47	6 542,94
9	Котел водогрейный КВ-400\95Т (инв. № 377), г. в. 2009, мощность 400 кВт. Котел водогрейный (инв. № 374), г. в. – 2008	**5 460,00**	273,00	546,00
10	Теплотрасса (инв. № 12), г. в. – 1984	**46 800,00**	2 340,00	4 680,00
11	Станок правильно-отрезной 1Д-162-01 (инв. № 331), г. в. – 1992	**3 300,00**	165,00	330,00
12	Агломератор А02.00.00.000 (инв. № 358), г.в. 2004, мощность привода 15 кВт	**1 860,00**	93,00	186,00

Продавец: ОАО «Речицкий завод «Термопласт», ул. Чапаева, 57, 247500, Гомельская область, г. Речица, **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 554-10-33, управляющий в деле о банкротстве Олейник Павел Станиславович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 23 сентября 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 2 октября 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от **21.03.2020 г. № 56 (29170). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.**

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

Люстэрка лёсу

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

З кнігі «МОЙ ФІЗМАТ»

(Працяг. Пачатак у нумары за 22 верасня)

Уладзімір Мікалаевіч БОРБАТ

Набор студэнтаў на фізмат заўсёды быў праблемны. Конкурс — 1,1—1,2 чалавека на месца. Але сярэдні бал атэстата для паступлення на гэты факультэт заўсёды заставаўся самы высокі ў параўнанні з абітурыентамі іншых факультэтаў, нават з гістфакам, дзе конкурс быў пяць чалавек на адно месца. Калі я працаваў старшынёю экзаменацыйнай камісіі па матэматыцы, пасля пісьмовага экзамену мне даводзілася выкладчыкаў літаральна за руку трымаць, інакш бы яны гэтулькі двоек наставілі, што адразу склаўся б недабор. А так мы прапускалі абітурыентаў на вусны экзамен і тым самым выратоўвалі абстаноўку.

Вучоба на фізмаце заўсёды была нялёгкай. Для гэтага патрэбны былі пэўныя здольнасці, пры гэтым школьныя поспехі далёка не заўсёды ў інстытуце пацвярджаліся. Той аб'ём матэматычнага матэрыялу, які з першых дзён абрушваўся на студэнта, не кожны мог вытрымаць. Адлічэнняў за непаспяховасць на фізмаце традыцыйна было шмат. Таму мы ўсямерна падтрымлівалі ранні школьны набор для наступнай вучобы на факультэце, у прыватнасці, работу профільных фізіка-матэматычных класаў. Але гэтыя класы былі ў горадзе Магілёве, а гараджан пасля заканчэння фізмата накіраваць у сельскую мясцовасць было складана. Нават адпрацаваўшы там два гады па размеркаванні, яны абавязкова ізноў вярталіся ў горад. І тады дэкан Ягор Ягоравіч Сянько з прафесарам А. А. Столярам вырашылі адкрыць фізіка-матэматычны клас для сельскіх школьнікаў. Вызначылі для гэтага Княжыцкую школу ў Магілёўскім раёне. Яна была з інтэрнатам, што нас задавальняла. Распрацавалі вучэбныя праграмы, адабралі школьнікаў з усёй вобласці, знайшлі добрых настаўнікаў і нават новага дырэктара школы. Настаўнікам запрасілі Валодзю Борбата. Мы яго ведалі як добрага студэнта-матэматыка, і ён ужо меў да гэтага часу некаторы вопыт работы ў школе. Я, як і ўсе дацэнты фізмата, вёў спецкурс у гэтым класе і таму быў з Валодзем у пастаянным кантакце. Знешне Борбат прыгажуном не выглядаў: сутлаваты, паўнаваты, у акулярах, ды яшчэ і гаварыў спецыфічна, бубніў. Але дзеці яго адразу палюбілі. Ён цудоўна адчуваў матэматыку, у гэтым прадмеце ў яго не было цёмных плям, а для дзяцей заставаўся адкрыты і даступны. Быў яшчэ не жанаты, таму ўвесь свой час прысвячаў вучням.

Вучні ў Княжыцкую школу прыйшлі сапраўды добрыя. І працавалі мы з імі з вялікім задавальненнем. Але нашы задумкі пра якасны набор на фізмат з дапамогай гэтай ініцыятывы ўсё ж не ажыццявіліся. Ужо з першага выпуска класа да нас на факультэт паступілі ўсяго толькі тры вучні. Астатнія з поспехам вытрымалі ўступныя экзамены ў ВНУ Масквы, Мінска, ваенныя вучылішчы, тэхнічныя і медыцынскія інстытуты. Так паўтаралася некалькі гадоў, мы ўсе выкладваліся ў гэтай школе, вынікі нашай працы былі відавочныя і, безумоўна, увогуле для грамадства карысныя, але яны на наш фізмат ніяк не працавалі. І мы вырашылі адмовіцца ад гэтай ідэі. А як жа Валодзя Борбат?

У гэты час я загадваў кафедрай алгебры і геаметрыі і, ведаючы здольнасці Валодзі, запрасіў яго да сябе асістэнтам, але пры ўмове, што ён пойдзе ў аспірантуру па тэорыі лічбаў.

Кандыдацкую дысертацыю Борбат пісаў пад кіраўніцтвам вядомага беларускага матэматыка, прафесара Інстытута матэматыкі АН Беларусі Васіля Іванавіча Берніка. Васіль Іванавіч мне расказваў, як да яго ў лабараторыю першы раз прыйшоў Борбат. Валодзя заўважыў, што пры ўваходзе стаіць двухпудовая гіра, запытаўся, навошта яна тут? Яму жартам адказалі: «Калі здолееш яе выжаць хоць бы адзін раз — ты наш!» Борбат стаў моўчкі падымаць гіру. Гэты рэкорд у лабараторыі не пабіты да сённяшняга дня!

Абараніўся Валодзя паспяхова. Вярнуўся працаваць на кафедру. Разважаючы пра яго перспектыву, я запытаўся ў Берніка, ці зможа Борбат зрабіць доктарскую дысертацыю? Васіль Іванавіч адказаў без разваг: «Захоча — зробіць!»

Валодзя ажаніўся, у яго нарадзіўся сын. Жылі яны ў інтэрнаце. Борбат друкаваўся, чытаў курс лекцый па алгебры і тэорыі лічбаў, студэнты ўспрымалі яго добра. Не магу сказаць, што па характары ён быў душой кампаніі. Хутчэй наадварот — болей замкнуты, чым адкрыты. Але ад яго сыходзіла надзейнасць. Ён не адмаўляўся ад вучэбных нагрузак, ні з кім не ўступаў у канфлікты, адгукаўся на просьбы. Валодзю я і вырашыў даверыцца ў адной справе і тым самым дапамагчы яму ж самому ў вырашэнні жыллёвага пытання.

У нас у Магілёўскім педінстытуце быў геаграфічны факультэт, яшчэ даваенны. З прафесурай, з аспірантурай. Але ў 1970-я гады кіраўніцтва рэспублікі вырашыла яго закрыць, палічылі, што геафак БДУ падрыхтуе настаўнікаў геаграфіі для ўсёй Беларусі. Але не зусім так атрымалася, як меркавалі «наверсе»... Ужо ў 1980-я гады рэгіёны адчулі вострую запатрабаванасць у гэтых настаўніцкіх кадрах. Нам далі даручэнне тэрмінова аднавіць факультэт. Але гэта аказалася досыць няпроста. Праблема была перш за ўсё ў выкладчыцкіх кадрах. Ранейшыя прафесары і дацэнты разляцеліся па ўсім Савецкім Саюзе. Вярнуць іх ужо было немагчыма. Давялося выкарыстоўваць тыя сувязі і метады, што меліся ў нас, каб выйсці з сітуацыі, каб укамплектаваць штат выкладчыкаў па асноўных раздзелах геаграфіі. Так мы выйшлі на прафесара Б. М. Нешатаева. Яго бацька некалі працаваў у нас дацэнтам, а сам Барыс Мікалаевіч выкладаў у Сумскім педінстытуце, быў спецыялістам у галіне фізічнай геаграфіі. Ён паставіў дзве ўмовы: забяспечыць яго кватэрай і даць яму магчымасць самому вызначыць свой далейшы лёс пасля сямі гадоў работы ў Магілёве. Мы пагадзіліся. Нешатаеў адпрацаваў сем гадоў сумленна. І кватэру мы яму выдзелілі. Але ў Магілёў адмовілася пераязджаць яго жонка, і ён вырашыў вярнуцца ў Сумы. Прыйшоў да мяне як да рэктара, і сказаў: «Я стрымаў сваё слова — сем гадоў у вас добрасумленна адпрацаваў. І вы сваё слова стрымалі — выдзелілі мне кватэру. Ад'язджаючы, я магу аддаць сваю кватэру ва ўласнасць гарвыканкама. І тады інстытут яе згубіць. Я ведаю, што вы ў добрых адносінах з мэрам горада В. І. Шорыкавым, таму прапаноўваю такі варыянт: няхай выкладчык, які жадае атрымаць кватэру, заплаціць мне пяць тысяч долараў, а вы, Аляксандр Міхайлавіч, дамовіцеся з мэрам, каб гэту кватэру пакінулі за інстытутам. І гэтак чалавек атрымае добраўпарадкаванае жыллё!..»

Я задумаўся... Падняў спіс чаргавікоў на атрыманне жылля. Першым там стаяла прозвішча загадчыцы кафедры рускай мовы дацэнта Т. М. Міхальчук — выдатнага чалавека, вядомай паэтэсы, але... жанчыны. А другі ў гэтай чарзе стаяў Валодзя Борбат! І я вельмі хацеў яму дапамагчы. Таму пайшоў да губернатара вобласці Барыса Васілевіча Батуры, праўдзіва выклаў сітуацыю і папрасіў выдзеліць інстытуту кватэру. І ён пагадзіўся! Пасля гэтага я паклікаў Валодзю і расказаў яму аб прапанове Нешатаева. Борбат заўсёды вызначаўся здаровым розумам, і яму я вырашыў даверыцца ў гэтай справе. Яна ўсё ж такі была рызыкоўная. Валодзя не толькі пагадзіўся, але ён не хаваў сваёй радасці. Я толькі папярэдзіў і Нешатаева, і Борбата, што ўвогуле нічога не ведаю пра іх дамоўленасць. У выніку і Тамара Міхальчук, і Валодзя Борбат атрымалі кватэры.

Борбата спрабавалі прыцягнуць да адміністрацыйнай работы. Старавойтаў паклікаў яго да сябе ў намеснікі дэкана, але работа ў дэканаце ў Валодзі не склалася. Ён быў досыць вольны ў сваіх рашэннях і ўчынках. Мог, напрыклад, у абед зачыніць дэканат на ключ і пайсці праз вуліцу ў бар выпіць куфаль піва...

Я ўспамінаў Борбата і яго работу ў фізіка-матэматычным класе Княжыцкай школы ўжо ў той час, калі працаваў першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. У той год мы заўважылі недабор практычна на ўсе фізіка-матэматычныя факультэты рэгіянальных універсітэтаў. На фізматы не пайшлі нават дзяўчаты. Мяне гэта здзівіла. На прафесію настаўніка матэматыкі, інфарматыкі, фізікі дзяўчаты заўсёды ішлі ахвотна. Праца ў школе з дзецьмі, навучальны прадмет сам дысцыплінуе, за сваім знешнім выглядам трэба сачыць, начных змен няма, а выхадныя дні ёсць заўсёды, ды яшчэ канікулы, рэгулярны і немалы адпачынак. Чым не работа для разумнай жанчыны? Але — недабор! Гэтую сітуацыю мне растлумачыў рэктар БДУІРа, прафесар Міхаіл Паўлавіч Батура. Пасля гэтыя тлумачэнні я дакладваў Прэзідэнту.

У мой час, калі мы паступалі ў інстытуты, студэнтаў цікавіла, што на ўваходзе. Паступіў ці не? Куды — не так і важна. У Інстытут! А цяпер студэнтаў цікавіць, што на выхадзе? Дзе ён будзе працаваць і, галоўнае, колькі будзе зарабляць? Міхаіл Паўлавіч мне паказаў, што 83 студэнты, якія праходзілі ва ўніверсітэт для вучобы за бюджэтныя сродкі, перайшлі на другі факультэт, каб вучыцца на платнай аснове. І там, і там — ІТ-спецыяльнасць, але ў першым выпадку — размеркаванне на завод «Інтэграл» з сярэднім заробкам у 500 долараў, а ў другім выпадку можна ўладкавацца ў Парк высокіх тэхналогій з сярэднім заробкам у 1500 долараў. Вось яны, думаючы пра будучыню, і перайшлі на платную форму. Законы рынкавай эканомікі няўмольныя, і трэба іх паўсюль улічваць. Праблему набору студэнтаў на фізмат праз профільныя класы цяпер не вырашыш, патрэбны іншыя падыходы. Ды і ў ранейшыя часы мы з Уладзімірам Мікалаевічам Борбатам яе не рашылі, але набыты ў Княжыцкай школе вопыт нам па жыцці спатрэбіўся.

На фізмаце заўсёды былі ў пашане шахматы. Борбат лічыўся сярод моцных шахматыстаў. Увогуле, яго студэнты любілі, хоць на лекцыях ён працягваў бубніць. Памёр Уладзімір Мікалаевіч нечакана, у поўным росквіце сіл. Мой фізмат яго шчыра аплакваў, разумеючы, што згубіў высакакласнага дацэнта і добрага чалавека.

Пераклаў з рускай мовы Максім ВЕЯНІС.

(Працяг будзе.)

З нагоды

«І радзіламу краю служыць...»

У Выдавецкім доме «Беларуская навука» выйшла кніга Элізы Ажэшкі. У выданне ўвайшлі найбольш значныя яе творы — «Над Нёманам» і цыкл «Gloria Victis» («Слава пераможаным»). Сёння мы гутарым з іх перакладчыкам Анатолем БУТЭВІЧАМ.

— Хочацца гарэзліва спытаць: што ў вас з Ажэшкай?

— Мне здаецца, што чым больш мы будзем ведаць нашу даўнюю літаратуру, у тым ліку творы пісьменнікаў, якія хоць і не на мове нацыі, але апавядалі пра падзеі, што адбываліся на нашай зямлі, тым больш мы будзем упэўненыя, што наш гістарычны падмурак моцны і што на ім можна будаваць новы дзень пасхова і бесперашкодна. Мая вялікая ўвага да Ажэшкі абумоўлена тым, што ў нашага чытача не так шмат магчымасцяў знаёміцца з яе творамі: не ўсе яны перакладзены нават на рускую мову. На беларускай жа можна было знайсці малавата. У «Беларускім кнігазборы» дваццаць гадоў таму выходзіла трошкі апавяданняў і аповесці, традыцыйна аднесеныя да беларускіх: «Хам», «Нізіны», «Дзюрдзі». Мне ж здавалася, што і раман «Над Нёманам» мае права быць перакладзеным на беларускую мову. Хоць польскія матывы ў ім прысутнічаюць, але і беларускія не пакінуты без увагі, тое, пра што піша аўтар, адбывалася на нашай зямлі. Гэта па-першае. А па-другое, Эліза Ажэшка ўмела так выбудоўваць тэкст, каб ён не мог не захапіць, каб нельга было спыніцца, пачаўшы чытаць. Яна ўмела паказаць і характары людзей, і ўзаемадачыненні класаў, як сказалі б у савецкі перыяд, і прыроду, якая ў яе выступае асобным героем. І яшчэ адметнасць: калі пісаўся раман «Над Нёманам», у той краіне, у якой жыла аўтарка, існаваў такі прэс цэнзуры, што яна была вымушана карыстацца схаванымі сэнсамі. І тое, як ёй удалося расказаць пра падзеі паўстання 1863 года, надае раману дадатковую прыцягальнасць. А тое, пра што яна распавяла, змушае нас верыць фактам і дае падставы сцвярджаць, што не ўсе тагачасныя загадкі раскрытыя. Вось чаму я захацеў перакласці раман «Над Нёманам». Ну, а на пераклад цыкла «Gloria Victis» штурхае сама назва: «Слава пераможаным». Здавалася б, якая ім можа быць хвала. Але Ажэшка апявае ўчынкі паўстанцаў, называе іх сапраўдныя імёны і апісвае падзеі, сведкай і ўдзельніцай якіх была і сама.

— Побач з кнігамі якіх пісьменнікаў вы ставіце кнігі Элізы Ажэшкі?

— У розных матэрыялах, прысвечаных яе творчасці, раман «Над Нёманам» згадваецца ў кантэксце паэм «Новая зямля» Якуба Коласа і «Пан Тадэвуш» Адама Міцкевіча. Тое, што аб'ядноўвае гэтыя паэмы, прысутнічае і ў рамане — у тым, як узвышана паказаныя пачуцці, і ў тым, што прырода апісваецца як чалавек са сваёй рэакцыяй на падзеі, і ў тым, што сказана пра адносіны да зямлі і гаспадаркі. Перакладаючы твор, назіраючы ў ім мітрэнгі паміж уладальнікамі зямлі і тымі, хто ж арандуе і апрацоўвае, я заўважыў яшчэ адну паралель — з «Палескай хронікай» Івана Мележа. Тыя ж адносіны да зямлі, тое самае жаданне ж адхапіць, тыя ж бунтоўнасць і прага паразумення. А якая паэтычнасць у апісанні жніва! Мележ працягнуў паэтычную нітку, якую пачынала Ажэшка. Гэта яна апісала жніво так, быццам няма падзеі вышэй. Так для сялян і было. І яшчэ адна паралель: чытаючы пра жніво ў Ажэшкі, я згадваю сваю маці. Я нарадзіўся ў Нясвіжскім раёне, на хутары Язавец, вакол якога калгасныя палі цягнуліся як вокам сягнуць. І жыта жалі сярпамі. Тады жняркі з'яўляліся дзе-нідзе, а камбайнаў ніякіх і блізка не існавала. Дык вось, калі маці з імпэтам жала жыта сярпом, а я дапамагаў ёй складваць снапы ў мыдлі, так у нас іх называлі, яна заўсёды спявала. Відаць, так было лягчэй. Пачуцці, якія ў мяне выклікае апісанне жніва ў Ажэшкі, асацыіруюцца, такім чынам, з тым, што я і сам бачыў і ў чым браў удзел.

— Што скажаце пра «цяжкасці перакладу»?

— Прызнаюся, мне было трошкі складана, хоць польскія словы ўва мне з дзяцінства, ад памяці людзей той зямлі, якая да 1939 года была пад Польшчай. Пачаў я перакладаць тады, калі працаваў генконсулам у Гданьску, з 1996 года, а працягваў, калі быў паслом у Румыніі, і для мяне гэты пераклад стаў сцежкай да ўспамінаў пра асабістае, роднае, ра жыццё на хутары, дзе прырода вымушала падладжвацца, а не валадарыць. Такая прырода, як у рамане Ажэшкі. Вось гэтае жаданне — перакласці для іншых тое, што замілоўвае ўласную душу, — дапамагала шукаць патрэбныя словы. Наколькі ўдалося, ацэніць чытач. Ва ўсякім разе, першае выданне «Над Нёманам», якое выйшла ў «Мастацкай літаратуры» ў 2003-м у серыі «Скарбы сусветнай літаратуры», разышлося імгненна. Дасць Бог, і новы том «Беларускага кнігазбору», другі ў гэтай серыі том твораў Элізы Ажэшкі, будзе добрым падарункам для чытача.

— Ці не здаецца вам, што Ажэшка недаацэнена?

— Калі мы параўноўвалі яе творы з творамі Якуба Коласа, Адама Міцкевіча, Івана Мележа, то рабілі гэта ў першую чаргу на ўзроўні захапляльнасці для чытача. І гэта галоўная адметнасць яе творчасці. Калі створыш нешта, на ўласны пагляд геніяльнае, але чытачу непатрэбнае, — ацэнены будзеш у «нуль». А калі напісана нешта такое, што вымушае пранікнуць глыбока ў сутнасць, абуджае жаданне зрабіць нешта вартае для зямлі, на якой жывеш... Ажэшка сваёй творчасцю выклікае ўсё гэта, паказвае, як «радзіламу краю служыць», вучыць быць годнай асобай.

Гутарыла Святлана ВОЦІНАВА.
Фота Кастуся ДРОБАВА.

24 верасня а 16-й гадзіне ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры на Багдановіча, 13 у Мінску адбудзецца прэзентацыя кнігі Элізы Ажэшкі «Над Нёманам. Gloria Victis». У мерапрыемстве бяруць удзел перакладчык Анатоль Бутэвіч, а таксама рэдактары і даследчыкі, якія мелі непасрэднае дачыненне да падрыхтоўкі выдання. Уваход свабодны. Прадугледжана магчымасць набыцця кнігі і аўтограф-сесія з перакладчыкам.

ПРА МАЙСТЭРСТВА І МЕХ ГРОШАЙ

У свае 78 гадоў вясковая жанчына ўпраўляецца з трактарам «Беларус» і шмат чаго робіць па гаспадарцы

Нездарма ж кажуць, што таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Простая вясковая жанчына Вера Шыгалёва не толькі па-майстэрску кіруе трактарам, але пры неабходнасці знойдзе ў машыне любую непаладку. Яшчэ сама можа злажыць печ і пабудаваць з цэглы летнюю кухню. А ў печы потым спячэ духмяны грачанік і вышые ўласнаручна абрус. Пры гэтым Вера Васілеўна ведае ўсе тонкасці аграномічнай справы, бо на яе палях растуць памідоры розных сартоў і іншая агародніна. Адукацыі ў вясковай пенсіянеркі — усяго пачатковая школа і 78 гадоў жыццёвага вопыту.

ПРА ДЗЯЦІНСТВА, ЯКОГА НЕ БЫЛО

Адразу відаць, што Вера Шыгалёва з тых людзей, якія і паўгадзіны не могуць пасядзець без работы. Пакуль размаўляем, гаспадыня наразае памідоры для будучага соусу. Ураджай таматаў гэтым летам вырас нядрэнны, а вось збыць вырашчанае — самая вялікая праблема для фермераў і гаспадароў. Гэтым займаецца сын Аляксандр, з сям'ёй якога яна зараз жыве. Пра сваё жыццё пенсіянерка з вёскі Арэхава, што на Брэстчыне, разважае крыху па-філасофску:

— Дзяцінства ў мяне, можна сказаць, не было. Самыя «яркія» ўспаміны з малых гадоў падобныя на спецыфічнае адчуванне ў раёне страўніка, увесь час моцна хацелася есці. Як цяпер памятаю, зайшла да суседзяў, ixняя маці на стол высыпае вялікі чыгун бульбы, сям'я вячэрае бульбай з салёнымі гуркамі. Мне яны даюць дзве бульбіны і невялікі агурок. Я дзякую, з'ядаю. Выходжу, а адчуванне голаду не прападае. У нас адзін час і бульбы не было ўволю...

Нарадзілася ў 1942 годзе ў вёсцы Вотчын, — працягвае. — Бацьку забралі ў 1944-м на фронт, вярнуўся дадому ў 1947-м, ён актывіст быў, першы запісаўся ў калгас. Яго паважалі, франтавік, аўтарытэт, следам за ім тады многія заявы падалі. Але ж у нас тут доўга пасля вайны банды па лясах гойсалі. Аднойчы ён убачыў, як нягоднікі магазін рабавалі. Вось і прыйшлі за ім, каб пазбавіцца ад лішняга сведкі. Яго павялі ў лес, там і забілі. Нам жа нават пенсіі не давалі потым, бо нехта выказаў меркаванне, што ён сам мог пайсці ў банду. А хто тады асабліва разбіраўся? У мамы праз два месяцы пасля гібелі бацькі дзяўчынка нарадзілася. Так вось мы і выжывалі ўтрох. У школу толькі пачатковую хадзіла. Настаўніца ў нас была, да гэтай пары памятаю, Зінаіда Андрэеўна з Бранска, а я ў яе — адна з лепшых вучаніц. Таму з Хаціслава потым прыехаў дырэктар школы, угаворваў маці аддаць мяне ў інтэрнат, бо за 8 кіламетраў школа сярэдняя, час неспакойны. Прывёз для мяне чаравікі, сукенку, паліто, у мяне ж не было чаго апрануць. Але маці сказала, як адрэзала: «З граматы хлеба есці не будзе». І не пусціла.

СЯМ'Я І РАБОТА

Так Вера і пачала сваё працоўнае жыццё. Наймалася да гаспадароў пасвіць кароў на лета. Жыла па два тыдні ў аднаго, потым у другога, у трэцяга. Там кармілі і спраўлялі нейкую вопратку. Увосень за кожную карову давалі 200 рублёў. Для сям'і гэта была вялікая падмога. У пачатку 60-х, як і многія маладыя, паехала на заробкі ва Украіну. Адтуль прывезла паўтоны пшаніцы, мех цукру і 700 рублёў. «Як напяклі дома духмяных булак, во гэта было свята! — успамінае суразмоўніца. — Я тады папраўлялася, расцвіла як дзяўчына. У той год і сустрэла прама ў полі свайго Лёню. Ён быў малады спецыяліст, прыехаў па накіраванні інжынерам-механікам у калгас. Карову гнала з поля, пазнаёміліся. Лета сустракаліся, патанцавалі ў клубе, а восенню сям'ю ўжо стварылі». Так Вера Бягеза стала Верай Шыгалёвай.

Спачатку працавала даяркай у калгасе. Успамінае, як на першай пары рукамі кароў даілі. Акрамя таго ад даяркі патрабавалася корм жывёле раздаць і гной са стойлаў папрыбіраць. «А як дзяжурыш па кароўніку, то мусіш два прычэпы травы разнесці і падзяліць на дзевяць куч — па колькасці груп. Ды яшчэ і сварацца таваркі бывала: «Ты, маўляў, сабе найбольш пакінула». Вось такая работа была, і двое дзяцей ужо, і свая гаспадарка не малая, якую трэба было дагледзець. Спачатку працавалі і жылі ў Хаціславе, потым перавялі мужа ў Арэхава, ён загадваў калгаснай майстэрняй.

АД «ШАСІКА» ДА МТЗ

У Веры ўзніклі праблемы са здароўем. Пасля аперацыі ёй выдалі даведку, што цяжкая работа забароненая. На ферму не пойдзеш сілас цягаць і гной выграбаць, памеркавалі з мужам, ён параіў ісці вучыцца на трактарыста. Тут якраз Маларыцкае СПТВ філіял арганізавала, навучанне вялося ў вёсцы. Вось муж і сказаў ёй: «Будзеш ці не будзеш працаваць, час пакажа, а павучыцца год можаш, тым больш, што стыпендыю 48 рублёў плацяць». А калі стала вучыцца, зразумела, што гэта яе. Інтарэс да тэхнікі праявіўся адразу, гэта і майстры-інструктары заўважылі. Экзамен здала без праблем і паспяхова. У калгас якраз прыбыў трактар Т-16 (яго называлі «шасік», трактар, у якога кузаў спераду).

— Я на тым «шасіку» ўсё рабіла: сена касіла, бульбу акучвала, сянаж трамбавала, малако з вёскі вазіла. Раз заехала па сянаж, мае дзяўчаты грузяць ды бурчаць: «Вось Шыгаліха сядзіць, паглядае, а мы спіны гнём», а я ў адказ: «А хто вам не дае? Ідзіце вучыцеся». Некаторыя і пайшлі, але не атрымалася ў многіх. Напрыклад, Марыя, што са мной вучылася, і паўгода не папрацавала, размінялася з камбайнам раз, перавярнулася і болей за руль не села, сказала: не маё.

Праз тры гады ў гаспадарку прыйшоў новы Т-40, яго Веры Шыгалёвай далі як вопытнаму спецыялісту. Адразу давялося працаваць на вельмі адказным участку — на тралёўцы лесу. Бярвенні выцягвалі з дзялянкі, потым іх нагружалі ў прычэп і трактарыст везла драўніну на піларараму.

— Тэхніку я любіла, — успамінае Вера Шыгалёва. — Спачатку на трактары працавала, потым яшчэ шэсць гадоў была наладчыкам у майстэрні, працавала на рамонце трактароў.

ПРА ВОПЫТ ФЕРМЕРСТВА

А ў 1991 годзе калгасы сталі ўзбуйняць, мужа скарацілі на рабоце. І Шыгалёвы рызыкнулі ўзяць участак зямлі. Яны сталі фермерамі аднымі з першых у раёне. Купілі ў калгасе стары спісаны «шасік» і пачалі гаспадарыць. «Першыя свае чатыры гектары так апрацоўвалі, — смяецца гаспадыня, — раскажы сёння, не паверыць, хоць кіно здымай пра тое. Вырашылі пасправаваць прычапіць да трактара звычайны дзедаўскі плуг, які конь цягае. Спачатку я села за руль, ён становіцца за плуг, еду на першай скорасці, а ён крычыць, лаецца, не паспявае. Тады я здагадваюся, уключаю паніжаную, ён ужо паспявае, потым мяняемся, я станаўлюся за плуг. Намучыліся, але ўзаралі. Пасеялі, ураджай сабралі. Праз некаторы час зямлі ўзялі яшчэ, вырошчвалі агародніну, прадавалі патроху, тэхніку змаглі абнавіць. Праўда, пакуль знайшлі патрэбны севазварот, паездзілі ў лабараторыю, пасядзелі за літаратурай, параспытвалі ў людзей. На адным участку, напрыклад, не раслі памідоры, бо аналіз паказаў перадазіроўку гербіцыдаў. Аказалася, раней калгас тут перабаршчыў з ядахімікатамі, давялося зямлю мяняць».

Тады ўсё пачыналі з нуля, на ўсім гузы набівалі. Рынкі збыту трэба было асвойваць, гэта зусім новая справа для гаспадароў. Згадала Вера Васілеўна, як аднойчы яны ўвесь ураджай здалі оптам у нарыхтоўчую кантору. Тады толькі грошы беларускія з'явіліся, зайцы, вавёркі на іх намаляваныя. А выручку ім выдалі пачкамі з купюр невялікай вартасці. Іх аказалася столькі, што гаспадар прынёс звычайны мех, злажыў пачкі і закінуў за плечы. У той дзень ім яшчэ спатрэбілася да сваякоў заехаць. Зайшлі, а гаспадары ім з парога: «Куды вы з мяшком у хату працеся, кінъце яго ў сенцах». А яны ў адказ: «Як гэта, кінуць, там жа грошы!» Во смеху было потым.

— На зямлі, вядома, не разбагацееш, але на прыстойнае існаванне сям'і зарабіць можна, калі не ленавацца, — робіць выснову фермерка са стажам.

Ужо амаль пяць гадоў няма яе спадарожніка жыцця Леаніда Мікалаевіча. Справу падхапіў сын. Цяперашні трактар МТЗ-82 «Беларус» ужо чацвёрты па ліку ў гаспадарцы. Ёсць уся прычапная тэхніка. Вядома, на трактары ўпраўляецца Аляксандр Леанідавіч. Але і матулю ніхто з рахунку не спісвае. Аднойчы ў маладога гаспадара спіну прыхапіла, а работа была неадкладная, дык маці спакойна села за руль і ўсё што трэба зрабіла. «Калі капусту, скажам, грузім, то я не чакаю, каб хто пад'ехаў, сама сядаю і падганяю машыну. Для мяне гэта не праблема», — кажа яна.

І ПЯЧНІК, І МУЛЯР

Як і не была праблемай любая іншая работа з самых маладых гадоў Веры. Успомніла, як давялося складці грубку самой. «Ну, так выйшла, — разводзіць рукамі пенсіянерка. — У нас тады толькі сын нарадзіўся, а дом халодны, сцены бетонныя. Печка зусім развалілася». Муж сказаў ёй печ разабраць, абяцаў прывезці печніка. Яна расчысціла пляцоўку, прывезла на «шасіку» цэглы, гліны, а пячнік... так і не прыйшоў. Тым часам у суседзяў майстар з Маларыты печку клаў. Вось яна і панадзілася туды хадзіць і глядзець. А майстру весялей, цікаўнай кабеце ён расказвае, паказвае, падкрэсліваючы сваё ўменне, потым яшчэ сказаў, што як закончыць, то да яе прыйдзе. Калі ж работу скончыў, то і ў яе ўжо печка гатовая была. Вось здзівіўся дзядзька, сказаў толькі: «А я думаў, баба работы не мае, што стаіць гадзінамі, назірае». Тая печка і цяпер служыць новым гаспадарам. А сабе Шыгалёвы потым дом у Арэхаве пабудавалі, і печы ў ім яна ўжо як вопытны пячнік складвала. Неўзабаве і людзям стала дапамагаць, суседу печ злажыла, потым — другому, цяпер і не ўспомніць дакладна, колькі людзей каля яе агню грэецца. Летнюю кухню, падобную на невялікі дамок, з цэглы сама склала. Ці трэба казаць, што вялікую рускую печ у гэтай летняй кухні гаспадыня пабудавала таксама сама. Цяпер нярэдка шчыруе каля печкі, радуе сямейнікаў смакатой, бо на газавай пліце так смачна не зварыш. А пра гэтае памяшканне ўспомніла, зноў засмяялася: па суседстве хлопцы хату ўзводзілі, дык гаспадар неяк да слова сказаў, што побач жанчына летнюю кухню паставіла. Прыйшлі паглядзець: абышлі вуглы, памералі — і не паверылі, што сама.

Чацвёра дзяцей выгадавала, шасцёра ўнукаў мае. Усе працуюць, за ўсіх бабуля радуецца. Ужо і чацвёра праўнукаў падрастаюць. «На юбілей, дай Бог дажыць, — сказала, — вялікая сям'я збярэцца». Ёй ёсць што сказаць родным. Яна пражыла зусім нялёгкае жыццё, але не страціла аптымізму, жыццёвай цвёрдасці, гэта пра яе сказана: што нас не забівае, тое робіць нас больш моцнымі.

Са старшынёй Арэхаўскага сельскага Савета Святланай Віталеўнай ужо збіраемся развітвацца, калі Вера Васілеўна прыносіць здымак з сямейнага альбома, дзе яна 20-гадовая. З партрэта глядзіць прыгажуня, нечым падобная на актрыс пакалення 60-х. Размова заходзіць аб тым, кім бы магла стаць вясковая дзяўчына, каб ёй удалося атрымаць адукацыю. «Можа інжынерам, а можа, кнігу напісала б», — усміхаецца гаспадыня, паказваючы, што жартуе. Але мы ахвотна верым.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.
Маларыцкі раён.

БАГАЧ ПА-ЧЫЖОЎСКУ

У мінулыя выхадныя ў сталіцы другі раз запар адбыліся восеньскія кірмашы. У кожным раёне Мінска і яго мікрараёнах клапатлівыя фермеры, дзяржаўныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і працавітыя вяскоўцы-саматужнікі прывозілі і прадавалі лішкі ўраджаю, атрыманага на палетках, сотках, агародах і прысядзібных участках, у садах і гадавальніках, на ягадных плантацыях. Чым адметныя былі гэтыя гаманкія і шматлюдныя кірмашы? У першую чаргу тым, што яны супалі з часам, які спрадвеку ў нас называлі Багачом, — старажытным святам услаўлення ўраджаю і працы хлебаробаў.

Правядзенне восеньскіх кірмашоў на пляцоўцы каля спартыўнага комплексу «Чыжоўка-Арэна» — акцыя параўнальна новая, але яна ўжо прыжылася і палюбілася сталічным жыхарам, можна сказаць, стала традыцыяй. Да таго ж гэта самы вялікі з усіх сезоных кірмашоў. Нездарма чарговы раз я выправіўся здымаць менавіта ў мінскую Чыжоўку. А восеньскі кірмашовы сезон тут будзе працягвацца да апошніх выхадных кастрычніка.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Больш здымкаў з гэтай падзеі глядзіце на сайце zviazda.by

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703**
Продавец	**ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

Предмет аукциона
Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16

Наименование	Общая площадь кв. м	Инвентарный номер	Назначение	Адрес (№ дома)
Лот № 1				
Производственный корпус	1130,5	500/C-49698	Здание специализир. иного назначения	16
Диспетчерская	54,7	500/C-53818		16/12
Здание специализированное иного назначения (литейный цех)	7664,8	500/C-47329		16
Производственный корпус	4340,5	500/C-53224		16/1
Компрессорная	473,6	500/C-54017		16/15
Электропечь термическая	39,8	500/C-54018		16/16
Здание весовой	24,3	500/C-54019		16/17
Административно-хозяйственный корпус	2323,4	500/C-49697		16/23
Составные части и принадлежности: проезды, площадки, подкрановый путь, дорожки, подпорные стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница				
Склад	2328,4	500/C-53297	Здание специализир. складов, тор. баз, баз матер.-технич. снабжения, хранилищ	16/2
Склады	895,5	500/C-53808		16/8
Склады, гаражи	453,6	500/C-53897	Здание многофункцио-нальное	16/9
Склады, административные помещения, агрегатные	563,7	500/C-53846		16/10
Инженерный корпус	3348,6	500/C-46093	Здание административно-хозяйственное	16
Административно-производственный корпус № 4	19710,5	500/C-53638	Здание специализир. для производства машин и оборудования	16/3
Склад	2193,5	500/D-708019487	Складское помещение	д. 16 пом. 2
Строительный цех	507,9	500/C-53845	Здание специализир. для произв-ва строит. материалов	16/11
Насосная станция автомати-ческого пожаротушения	194,4	500/C-54016	Здание специализи-рованное коммунального хозяйства	16/14
Станция очистки сточных вод	305,1	500/C-54015		16/13
Градирня	39,1	500/C-55130	Сооружение неустан. назначения	16/18
Ливневая канали-зационная сеть	1077,5 м	500/C-1029279	Сооружение специализир. коммунального хозяйства	16
Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть	973,2 м	500/C-1029266		
Хозяйственно-бытовая канали-зационная сеть	764,5 м	500/C-1029275		
Тепловая сеть	236,7 м	500/C-1029272		

Иное имущество, входящее в состав лота: внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), кабельные телефонные сети (инв. № 12030041), оборудование распред. пункта РП-2 (инв. № 13041207), оборудование РП-2 (инв. № 13041173), конденсаторные установки (инв. №№ 13040254, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), трансформаторные подстанции (инв. №№ 13040099, 13040120), пульт распределительный (инв. № 13040780), комплекты трансф. подстанции (инв. №№ 13040082, 13040076, 13040053, 13040030), комплект. распред. устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсатная установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты грузовые (инв. №№ 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопассажирский (инв. № 28240071), объекты растительности (деревья 10 шт., газоны 10 шт.)

